№ 36 (490) 6 кастрычніка 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Трэці шлях у трэці сьвет




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## У пошуках нашай славы, або Гісторыя для беларусаў



Гісторыя змаганьня беларусаў за сваю дзяржаўнасьць у 1910-1930-я павінна заняць цэнтральнае месца ў патрыятычным выхаваньні моладзі. **Старонка 4.**

**вялікая вечарына беларускай паэзіі**

## СЁНЬНЯ

**5 кастрычніка Палац мастацтваў (вул.Казлова, 3), канфэрэнц–заля, 19.00. Болей – старонка 2.**

Канстытуцыйнаму акту ня быць. Прэс–канфэрэнцыя для расейскіх журналістаў: Аляксандар Лукашэнка ня хоча разрываць саюзныя дачыненьні з Расеяй першым, правакуе на гэта Маскву. **Старонка 7.**

Беларусь перажывае драматычны момант зьмены арыентацыі. Замест Расеі — трэці сьвет. Камэнтары Віталя Тараса і Аляксандра Класкоўскага. **Старонкі 8, 16.**

Фэльетон Лёліка Ушкіна. **Старонка 17.**



# У нумары


**камэнтары**

Андрэй Павач. У пошуках нашай славы, або Гісторыя для беларусаў ... 4
Віталь Тарас. Вада ў калене 8
Павал Севярынец. Табліца Мендзялеева ... 14
Аляксандар Класкоўскі. Атакі на вятрак ... 16

**люстра дзён**

Канстытуцыйнаму акту ня быць ... 7
Мілінкевіч узначаліць камітэт «За свабоду Дашкевіча» ... 7
«Шмат малых мурашоў і ніводнага вялікага» ... 10
Мілінкевіч застанецца лідэрам апазыцыі ... 10
Польскіх ксяндзоў вымушаюць зьехаць ... 11
«НН» адмовілі ў залі ... 11
Іванюкевіча аштрафавалі на 112 даляраў ... 11
Вацлаў Гавэл: Прыём Украіны й Беларусі мусіць стаць вянцом стварэньня Эўразьвязу ... 11
Нілу Гілевічу – 75 ... 12
N.R.M. у Стакгольме ... 12
Беларусы ў Антарктыдзе будуюць новую БелКУ ... 12
Бульбе далі дзесяць сутак 13
Хроніка ... 14
У Воршы адновяць адзіны ў Беларусі пячорны храм .. 20
І шыльда не ўратавала ... 20
Нясьвічкі замак рэстаўруюць шляхам дэмантажу ... 20

**левым вокам**

Лёлік Ушкін. Оба–на, інтэграцыя! ... 17

**пошта рэдакцыі**

Аўдыё і відэа з Быкавым .. 18
Я пазнала таго маладафронтаўца ... 18
Іншыя лісты ... 18

**з усіх старон**

Як кітайскі абутак уратаваў Беларусь ад санкцыяў ... 19

**культура**

Сымон–музыка выйдзе ў джынсах ... 21
Фабіян і Людвіка ў «Беларускай хатцы» ... 22

**газэтка дзеткам**

Як нараджаецца газэта ... 24

**вольны час**

Мядзьведзік у Бэрліне ... 26
Спэцэфэкты ўсё тыя ж ... 27
Дзе варта быць ... 27
Варта паглядзець ... 27
Мэгакрыжаванка ... 28
Шалкевіч прызямліўся ... 29

**мы самі**

Дзякуй ... 30

**калі б...**

Малюнкі Лёліка Ушкіна .... 31


## Сьвяткаваньне 100-годзьдзя «НН» у Полацку

Адбудзецца **6 кастрычніка а 19.30 у Полацку** ў парафіяльнай залі касьцёлу Сьвятога Андрэя Баболі. Уваход вольны, чакаюцца прыемныя сюрпрызы. Даведкі праз тэл. (029) 718-97-31.

**50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА**

## Беларусь перажывае пераломны момант

Грузінскі тон Аляксандра Лукашэнкі на адрас Расеі ў часе прэс-канфэрэнцыі ў мінулую пятніцу мог азначаць толькі адно: на маскоўскім накірунку ўсё зусім кепска. Лукашэнка ня хоча разрываць саюзныя адносіны з Расеяй першым, аднак правакуе на гэта Маскву. Мяняецца замежнапалітычная арыентацыя краіны, на месца Расеі прыходзіць Трэці сьвет – Вэнэсуэла, Іран і іжа зь імі. Узамен за захаваньне добраахвотнае каляніяльнае залежнасьці лукашэнкаўская Беларусь атрымлівала ад Масквы мільярды два даляраў за год на газе, нафце і гандлёвых прэфэрэнцыях. Болей прадацца няма каму, цяпер пра датацыі прыйдзецца забыць. Ці значыць гэта, што нас чакае зьмена «сацыяльнага кантракту» і ўнутранай палітыкі? Што стане зь беларускай эканомікай? У гэтым нумары «НН» мы падступаем да аналізу новай палітычнай сытуацыі.

**Старонкі 7, 8, 16, 17.**

## Сёньня – вялікая вечарына беларускай паэзіі

**5 кастрычніка, у чацьвер** адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Аляксандра Фядуты «Паэтычны аглядальнік» з удзелам герояў: чакаюцца Рыгор Барадулін, Лера Сом, Міхась Скобла, Юрка Голуб, Юры Пацюпа, Джэці, Людка Сільнова, Юры Бадак, Галіна Дубянецкая, Віктар Шніп, Ірына Багдановіч, Глеб Лабадзенка. Вядзе вечарыну Зьміцер Бартосік. **Палац мастацтваў** (вул.Казлова, 3), **канфэрэнц-заля, 19.00**. Уваход вольны, чакаюцца прыемныя сюрпрызы. Сардэчна запрашаем: з гэтай вечарыны распачнецца сьвяткаваньне 100-годзьдзя газэты ў сталіцы.

# НОВЫ НУМАР «ARCHE»




У сувязі з прыпыненьнем выхаду часопісу «ARCHE» тэксты чарговага, кастрычніцкага нумару можна прачытаць толькі на сайце часопісу **arche.bymedia.net**

# У пошуках нашай славы, або Гісторыя для беларусаў

Гісторыя змаганьня беларусаў за сваю дзяржаўнасьць у 1910–1930-я павінна заняць цэнтральнае месца ў патрыятычным выхаваньні моладзі. Піша **Андрэй Павач**.



ЯЗЭП ДРАЗДОВІЧ, «ПАГОНЯ ЯРЫЛЫ», 1922 Г.

## I

Размовы аб патрыятызьме і ідэалёгіі «белорусского государства», што апошнім часам пачалі ўсё часьцей зьяўляцца ў афіцыйных СМІ, выклікаюць у нармальнага чалавека жаданьне адмахнуцца ад іх рукою: «Ды ну іх, няхай гавораць, што хочуць». Але адмахвацца, думаю, усё ж такі ня варта, «патрыятычная» прапаганда так ці іначай дабіраецца да кожнага, у кагосьці дзяцей прымушаюць ісьці ў піянэры, хтосьці павінен выпісваць «Саўбелку», і ўсе мы слухаем радыё і, пераключаючы каналы тэлебачаньня, трапляем на ўсялякія там «Жорсткія размовы» і «Размовы па сутнасьці». Адным словам, калі доўга на глузды «капаць», то ў любога чалавека можа нешта паехаць, а калі паедзе, можа быць ужо позна, і шэсьці з паходнямі ў 1933—1939 гадох на плошчах адной эўрапейскай краіны — таму самы яскравы доказ.

Дэталёва разьбіраць гістарычныя ідэалягемы беларускіх ідэолягаў у цэлым і гісторыкаў у прыватнасьці, думаю, пакуль ранавата, але галоўныя моманты лукашэнкаўскай гістарычнай прапаганды вылучыць ужо можна.

Традыцыйным яшчэ з савецкага часу пачаткам беларускай нацыі і, адпаведна, ідэалягічнай прапаганды, ёсьць падзеі 1917 г., нездарма Беларусь засталася адзінай у Эўропе краінай, дзе сьвяткуецца 7 лістапада. Але, здаецца, трываць гэта будзе нядоўга. Яшчэ леташняй восеньню аўтару гэтага артыкулу давялося пісаць у «НН» пра поўнае выраджэньне сьвяткаваньня Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі ў нашай краіне. Думаю, што значэньне 7 лістапада ў беларускім ідэалягічным пантэоне будзе паступова падаць і па нейкім часе ўвогуле скасуецца. Гэта зразумела, нагадваць аб нейкай далёкай рэвалюцыі ў гады «стабільнасьці і росквіту» зусім недарэчна.

Іншая справа — Вялікая Айчынная вайна, якая была, ёсьць і да самага канца будзе цэнтральным пунктам беларускай ідэалягічна-гістарычнай прапаганды. Ужо не з кастрычніка 1917-га, як дваццаць гадоў раней, а з чэрвеня 1941-га пачынаецца наша гісторыя. Аб тым, як падзеі чатырох самых крывавых гадоў беларускай гісторыі служаць нашым ідэолягам, можна гаварыць доўга, ды шаноўны чытач увесь час сам слухае аб гэтым па радыё і бачыць на вуліцах і па тэлевізіі. Адзначым толькі, што праўды аб гісторыі беларусаў у Другой сусьветнай стала яшчэ менш, чым было за савецкім часам. Нядаўна мне ў рукі трапіў зборнік навуковых артыкулаў, прысьвечаны 60-годзьдзю вызваленьня Беларусі. Зборнік гэты састарэў гадоў за трыццаць да яго выданьня. Чаго толькі вартыя артыкулы кшталту: «Пра перавагу савецкай стратэгіі ў апэрацыі «Багратыён».

Колькасьць беларускіх партызанаў расьце як грыбы. Калі ў савецкі час іх налічвалі каля 400 тысяч, то ў сучасных падручніках (заўважце, не манаграфіях, а падручніках) яна падскочыла да 700 тысяч і нават мільёна чалавек. Сапраўды партызанская рэспубліка. Нельга таксама пакінуць па-за ўвагай манаграфію цяперашняга дырэктара Інстытуту гісторыі Акадэміі навук Беларусі Кавалені, прысьвечаную пранямецкім саюзам моладзі ў Беларусі ў гады вайны. На фатаздымках у кнізе калёна юнакоў маршыруе пад бел-чырвона-белым сьцягам, на якім рукою нейкага ня надта прафэсійнага

фатографа-фальсыфікатара намаляваная свастыка. Шкада, вельмі шкада, што сапраўды разумным кнігам, кшталту працы К'яры «Рэчаіснасьць за лініяй фронту», няма дарогі да нашых настаўнікаў і іншай чытацкай браціі.

Наступным «гітом» беларускай гістарычна-патрыятычнай прапаганды выступаюць гэтак званыя «дасягненьні беларускага народу ў пасьляваенны час». Маецца на ўвазе найперш імклівае разьвіцьцё прамыслова-навуковага патэнцыялу рэспублікі, павышэньне ўзроўню жыцьця людзей, а таксама роля БССР у барацьбе за мір у ААН (хоць роля гэтая, зразумела, была больш чым сьціплая). Гэты напрамак прапаганды вельмі выгадны, бо дае старэйшаму пакаленьню бюракратыі адчуваньне заслужанасьці, маладзейшаму ж (былыя камсамольскія лідэры, якім цяпер па 40 зь нечым гадоў і якія ўліліся ў сваю дзейнасьць на пачатку 1980-х) — канкрэтны ўзор і мэханізм дзеяньняў у адміністрацыйнай сфэры, маецца на ўвазе прапаганда праз СМІ, дзейнасьць моладзевых арганізацыяў і інш. Дарэчы, цікава, менавіта ў гэтым пэрыядзе гісторыі ўлады на нейкі час знайшлі пэрсаналію, якую палічылі вартай да правядзеньня паралеляў зь першым прэзыдэнтам. Гэта быў партызан-сакратар Пётар Машэраў, якому, паводле іхняга меркаваньня, наканавана было адыграць ролю своеасаблівага мангольскага Чынгізхана, пачынальніка беларускай дзяржаўнасьці. Машэраў мусіў быў увасабляць пераемнасьць, быць прыступачкай да Лукашэнкі і ня болей.

Аднак падзеньне папулярнасьці асобы Машэрава сярод беларускіх гісторыкаў і ідэолягаў было такое ж імклівае, як і ейны ўзьлёт. Чаму гэтак адбылося, можна толькі здагадвацца. Магчыма, даўся ў знакі Лукашэнкаў канфлікт з дачкой былога першага сакратара, але найхутчэй проста пачалі зьяўляцца параўнаньні не на карысьць сёньняшніх уладаў. Усе выдатна помняць, як шанаваў беларускую культуру Машэраў, сябраваў з Уладзімерам Караткевічам, абараняў Карпюка і Быкава, як шпацыраваў па вячэрнім Менску, маючы толькі аднаго ахоўніка, які ішоў у трыццаці мэтрах за ім. Не выклікае сумневаў адно: «забыцьцё» Машэрава носіць выразны дырэктыўны характар, і перайменаваньне ў траўні 2005 г. праспэкту ў ягоны гонар на праспэкт Пераможцаў — самае яскравае гэтаму пацьверджаньне. Вось так у нашай краіне, кіруючыся меркаваньнямі, далёкімі ад гістарычнай аб'ектыўнасьці, адных сёньня ўзносяць да самых вяршыняў, каб заўтра замяніць іх імёны шыльдамі ў гонар безыменных, абстрактных і таму вельмі зручных для ідэалягічнага жангляваньня Пераможцаў.

Усе спробы асьвятленьня падзеяў 1991—2006 г., накшталт «Найноўшай гісторыі Беларусі», адносяцца да чыста ідэалягічнай сфэры, таму разглядаць іх тут наўрад ці мэтазгодна.

Любая сыстэма, аднак, непазьбежна эвалюцыянуе і, адпаведна, шукае ідэйны грунт для свае эвалюцыі. Былым трэцім сакратарам ужо засьціць іх камсамольска-калгаснае мінулае, яны хочуць дарагіх машынаў, палацаў, своеасаблівага, так бы мовіць, дваранскага статусу. Таму сыстэму апошнім часам пачынае выразна схіляць у бок больш глыбокага «гістарычнага пошуку» ў часе найперш Расейскай імпэрыі. І вось тут на арэну выходзяць прыхільнікі «трыадзінага рускага народу», Мураўёва-вешальніка і «великого и могучего русского языка», якім жудасна недаспадобы прызнаныя нават у савецкі час патрыярхі беларускага адраджэньня Ф.Багушэвіч, К.Каліноўскі і інш. Аднак навукова абгрунтаваць, напрыклад, карысьць для беларусаў «русіфікацыі» ў XIX і XX ст. ніводзін здаровы гісторык ня здолее нават пад руляй пісталета. Ня могуць гэтага зрабіць і 80-гадовыя мастадонты ад гісторыі кшталту Трашчанка і Петрыкава, таму і «разраджаюцца» яны не манаграфіямі, а публіцыстыкай або, у лепшым разе, падручнікамі. Ня дзіва, што новая «патрыятычная» кампанія насуперак, здавалася б, свайму прамому прызначэньню, вядзе да русіфікацыі выкладаньня гісторыі, новых чыстак у ВНУ і навуковых установах, ганеньняў супраць усіх сапраўды патрыятычных культурна-гістарычных згуртаваньняў (рыцарскіх клюбаў, фольк-гуртоў і інш.)…

Дзеля адсутнасьці натуральнай, а не кабінэтнай патрэбы ў фармаваньні патрыятычнага грамадзтва і дзеля адсутнасьці дакладных фармулёвак зьверху такое шуканьне ісьціны непазьбежна ўкшталтоўваецца ў гульню «мясцовых» патрыятызмаў, якія найбольш залежаць ад густу тых ці іншых чыноўнікаў. Так, у Гомелі вуліцы называюць у гонар царскіх генэралаў, у Сьвіслачы ўсталёўваюць помнік Сталіну, а ў Лідзе хутка маняцца паставіць помнік Гедыміну.

Усе гэтыя «патрыятызмы» зазвычай да нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі маюць вельмі малое дачыненьне, тым больш што большасьць чыноўнікаў, якія б высокія пасады яны ні займалі, баяцца дэманстраваць якое-кольвек веданьне гісторыі і стараюцца захаваць існы, хоць і дашчэнту прагнілы стан рэчаў. З гэтай прычыны мы ў большасьці гарадоў працягваем шпацыраваць вуліцамі Калініна і Кірава, а нашыя дзеці зьяжджаюць на роліках з гранітных п'едэсталаў помнікаў Чапаеву і Леніну. Такая бездапаможнасьць уладаў у стварэньні жыцьцяздольнай канцэпцыі нацыянальнай гісторыі ставіць нас над прорвай: нацыя перастае разумець, што ж, нарэшце, яднае ўсіх яе прадстаўнікоў у адзінае цэлае і робіць беларусамі.

## 2

Прызнаюся шчыра, што я не прыхільнік якой-кольвек «ідэалягізацыі» (ці тое лукашэнкаўскай, ці тое нацыянальнай) гістарычнай навукі. Слова «ідэалягізацыя» занадта нагадвае слова «ідэалізацыя», гэта значыць спрашчэньне, аднабаковасьць, мэтафізычнасьць, калі хочаце. А дзе ёсьць месца спрашчэньням, пры чым на карысьць абгрунтаваньня зьявішчаў сёньняшняга дня, там ніколі не было і ня будзе месца сапраўднай навуцы. Але ёсьць такая ўпартая рэч, як школьны падручнік. На ягоных старонках ніяк не разгорнеш аргумэнтацыі паводле ўсіх правілаў мэтадалёгіі гісторыі, школьны падручнік — прадукт працы гісторыкаў, надзвычай важны ў грамадзкім сэнсе і таму пастаянны аб'ект спэкуляцыяў.

Што б ні гаварылі, але напісаць падручнік параўнальна лёгка. Уявім, што вы — кандыдат навук векам каля пяцідзесяці, які гадоў дваццаць таму абараніў дысэртацыю на тэму, прысьвечаную, скажам, барацьбе беларускіх прафсаюзаў хімічнай прамысловасьці за павышэньне ўзроўню жыцьця тых самых хімікаў. Вы вырашылі забіць двух зайцоў — зарабіць грошай і прадэманстраваць сваю прыхільнасьць да ўладаў (чаму ж не, можа, здолееце скочыць з пасады заштатнага дацэнта ў дырэктары якога інстытуту). І вось праца пайшла. Некалькі соцень тэндэнцыйна падабраных фактаў, месяц-два практыкаваньняў у красамоўстве — і

**Працяг на старонцы 6.**

**Працяг са старонкі 5.**

перад вамі ляжыць рукапіс новага падручніка ці дапаможніка. Усе камісіі і рэцэнзэнты вам добра знаёмыя, і ваш падручнік ужо ў праграмах, вы маеце неслабы ганарар (ня тое, што за манаграфію, за друк якой давядзецца яшчэ і самому плаціць грошы), ваша кар'ера рэзка пайшла ўгару, і нічога ня трэба было вывучаць і дасьледаваць, толькі часьцей цытуй Першага, АНТ і гучней крычы «Ўра!» (але не забывайся, крычаць трэба па-расейску).

Самі разумееце, шаноўныя чытачы, якое дачыненьне да гістарычнай праўды будзе мець падручнік, напісаны такім спэцыялістам у прафсаюзах, і якая зь яго будзе карысьць. Але што зробіш, дзе ёсьць ідэалёгія, там няма сапраўднай гісторыі, журналістыкі, літаратуры… Я ў ідэале, можа, увогуле адмовіўся б ад канцэпцыі падручнікаў з гісторыі і напіраў бы на працу з аўтэнтычнымі тэкстамі, але наша закасьнелая сыстэма адукацыі на гэта пакуль ня здатная. «Больш навукі і менш падручнікаў», — усклікаюць сапраўдныя гісторыкі. «Менш навукі і больш падручнікаў», — адказваюць ім штатныя ідэолягі і іх падбрэхічы-гісторыкі з інстытутаў і ўнівэрсытэтаў краіны.

У пачатку 1990-х доктар гістарычных навук сьвятой памяці Міхась Біч прапанаваў канцэпцыю нацыянальнай гісторыі Беларусі, нарожным камянём якой было б фармаваньне беларускай нацыі і нацыянальнай дзяржаўнасьці. Зразумелая, дарэчная і натуральная для любога народу канцэпцыя. Але ды дзе там: «Што за нацыянальная дзяржаўнасьць, можа, марыянэткавая БНР, створаная пры дапамозе нямецкіх штыхоў?» — пачуўся раззлаваны голас з-за інстытуцкіх катэдраў, і мільённыя атрады партызанаў часу Вялікай Айчыннай лёгка засланілі невялікія групы ахвярных беларускіх барацьбітоў. Здаецца, якое можа быць параўнаньне: слаўная партызанская рэспубліка і кучка міністраў-бээнэраўцаў. Нават няма пытаньняў, на што павінна «ціснуць» ідэалягічная прапаганда. Але далёка ня ўсё так проста. Мне здаецца, заняўшыся раней забароненымі тэмамі пэрыяду 1917—1920 г., маладыя тады нацыянальныя гісторыкі крыху занядбалі непасрэдны працяг усёй БНРаўска-БССРаўскай гісторыі: у першую чаргу магутную хвалю змаганьня беларусаў за незалежнасьць у 1920-х г., найперш у Заходняй Беларусі. Гэта, выказваючыся словамі Арсеня Ліса, цэлы схаваны ад нас пакуль кантынэнт нацыянальнай гісторыі.

У пачатку 1920-х г. на Гарадзеншчыне і Віленшчыне беларусы разгарнулі шырокую антыпольскую партызанку, іх пасьля судзілі па 50, па 70 чалавек у Беластоку, Вільні і Горадні. Некалькі радкоў зь дзёньніка польскай пісьменьніцы Зоф'і Налкоўскай, якая ў той час наведвала гарадзенскі астрог: «Малады вязень Венцыс, чакае суду два гады… Беларус… Чалавек чысты, які найбольш кахае сваю Радзіму… У турме атрымаў сухоты, памёр 26 кастрычніка 1924 году». Такіх патрыётаў, як гэты нікому не вядомы Венцыс, былі тысячы, мала, да болю мала ведаем мы пра іх, ня вучымся на іх учынках, ня ставім ім помнікаў, хоць бы пакуль і ў выглядзе належных навуковых дасьледаваньняў і папулярных выданьняў… У 1925—1927 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала легендарная Беларуская сялянска-работніцкая грамада з 120 тысячамі сяброў і паловай мільёна прыхільнікаў. У Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі таксама была краса беларускай моладзі, на жаль, пасьля здраджанай і абылганай, што, праўда, таксама ніколі не прынізіць яе подзьвігу ў справе барацьбы за беларушчыну супраць нацыянальнага прыгнёту. Яшчэ адна заходнебеларуская партыя — Беларуская хрысьціянская дэмакратыя, дала нашай гісторыі непераўзыдзены дасюль узор трываласьці і вернасьці ідэалу незалежнасьці Беларусі. Менавіта БХД пранесла гэты ідэал праз цёмныя 1930-я г., калі ў БССР перастралялі амаль усіх нацыянальных дзеячаў, а імёны Скарыны, Багушэвіча, Каліноўскага намагаліся ачарніць і забыць. Менавіта заходнебеларускія выданьні 1920—1930-х зьбіралі, чыталі, і на іх выхоўваліся нашыя слаўныя шасьцідзясятнікі кшталту Караткевіча, Ліса, Мальдзіса ці Кісялёва. Усё, што мае цяпер Беларусь на ўсход ад Менску, здабыта дзякуючы змаганьню беларусаў з-пад Горадні, Наваградку, Пінску, Беластоку й Вільні.

> У выніку маніпуляцый сёньняшніх ідэолягаў нацыя перастае разумець, што ж нас усіх яднае і што ж робіць беларусамі.

Ніколі не было б узбуйненьняў, ніколі б мы ня ўбачылі Гомелю зь Віцебскам і Магілёвам, калі б ня гэтае змаганьне. Усё, што давала беларусам савецкая ўлада, яна давала з аглядкай на Заходнюю Беларусь, каб толькі паказаць, як слаўна тут, у БССР, жывецца беларусам. Але і «ўсходнікі» ня спалі. Яны ў 1920-х заклалі самыя моцныя камяні ў падмурак будучай дзяржаўнасьці: Інбелкульт, БДУ, Акадэмія навук, унармаваная беларуская мова, багатая літаратура. Ёсьць нам каму ставіць помнікі і ў чый гонар называць вуліцы: Браніслаў Тарашкевіч і ягоныя сябры беларускія дэпутаты сойму Польшчы, Усевалад Ігнатоўскі, Алесь Адамовіч, Тамаш Грыб, Вацлаў Ластоўскі… А колькі было безыменных герояў: настаўнікаў, пісьменьнікаў, навукоўцаў, падпольшчыкаў, што гнілі ў польскіх ды расейскіх турмах! На памяці пра іх павінна будавацца наша нацыянальная ідэя (толькі, барані Божа, не ідэалёгія). Гэта будзе канцэпцыя слаўнага адзінства ўсіх беларусаў у барацьбе за незалежнасьць, дзе Заходняя Беларусь вяла рэй і паказвала прыклад сваім змаганьнем Савецкай Беларусі, а тая ўдала карысталася атрыманым і будавала нашую краіну.

Адным словам, нацыянальны міт XX стагодзьдзя ёсьць. Ён ёсьць, і яго ня можа ня быць, бо калі б не было таго змаганьня, то не было б і незалежнай Беларусі. Менавіта гісторыя змаганьня беларусаў за сваю дзяржаўнасьць у 1910—1930-я г. павінна заняць цэнтральнае месца ў патрыятычным выхаваньні моладзі і прыйсьці на зьмену міту аб партызанскай рэспубліцы. Але гэта зусім ня значыць, што трэба з нашай гісторыі зноў нешта паводле старых звычаяў выкрэсьліваць. Спадзяюся, у новай Беларусі ніхто гэтым займацца ня будзе, памяць — занадта крохкая і сур'ёзная рэч.

Пакуль сыстэма ня вычарпала рэсурсу, яна яшчэ піша падручнікі і перакройвае на свой лад нацыянальную гісторыю, але мне здаецца, што сёньня вырашальнае значэньне мае ўжо ня сіла ўзьдзеяньня ўладаў і гістарычнага афіцыёзу, але адсутнасьць сур'ёзнага процідзеяньня нацыянальных гісторыкаў, як старэйшых, так і маладых. Неабходнасьць стварэньня моцнай суполкі беларускіх гісторыкаў, якія ніяк не зьвязаныя з афіцыйнай навукай у Беларусі, даўно насьпела, але гэта зусім іншая гісторыя, і аб ёй іншым разам.

*Горадня*

# Канстытуцыйнаму акту ня быць

Прэс-канфэрэнцыя для расейскіх журналістаў: Аляксандар Лукашэнка ня хоча разрываць саюзныя дачыненьні з Расеяй першым, правакуе на гэта Маскву.

Саюзная дзяржава, на думку Лукашэнкі, можа будавацца толькі на ўмовах роўнасьці дзьвюх краінаў. Відаць, у сьвятле апошніх мытных скандалаў зь беларускімі таварамі прагучала заява аб адкрытасьці межаў.

Беларусь ніколі ня ўвойдзе ў склад Расеі губэрняй ці акругай, у чарговы раз заявіў Лукашэнка.

Беларускі лідэр ня бачыць праблемы ў тым, што ў саюзнай дзяржавы няма свайго лідэра, бо на сучасны момант ён і не патрэбен. Такім чынам, саюзнага прэзыдэнта ня будзе.

Можна было чакаць, што перад прадстаўнікамі расейскіх СМІ Лукашэнка яшчэ раз засьведчыць сваё прынцыповае жаданьне будаваць саюзную дзяржаву і абвінаваціць Крэмль, што менавіта ён тармозіць інтэграцыю братніх народаў. Аднак гаворка пайшла іншым чынам.

Лукашэнка ізноў пайшоў на шантаж расейскага боку ў газавым пытаньні. Ён адзначыў, што калі Расея пойдзе на падвышэньне коштаў на блакітнае паліва, то гэта без сумневу азначае разрыў усіх эканамічных стасункаў між нашымі краінамі. Лукашэнка папярэджвае расейскі бок, што ў супрацiўным выпадку ён



Чавэс і Мугабэ — новая сяброўская дуга Беларусі.

REUTERS

можа пайсьці на больш шчыльнае супрацоўніцтва з Эўразьвязам.

Кіраўнік Беларусі запэўніў, што не зьбіраецца прадаваць расейцам «Белтрансгаз» за 300 мільёнаў даляраў. Вось каб яны прапанавалі 2 мільярды, Лукашэнка, магчыма, і падумаў бы. Бо інакш яму пагражае «турма». І ўпершыню ён адкрыта, хоць і гіпатэтычна заявіў, што акцыі «Белтрансгазу» могуць быць прададзеныя не расейцам, а трэцяму боку, а канкрэтна — амэрыканцам.

У парыве захапленьня кіраўнік дзяржавы выгукнуў да расейскага боку: «Вы страціце свайго адзінага саюзьніка, вы проста зганьбіце сябе».

Лукашэнка выступае ў ролі прагназоўцы, калі кажа, што на бліжэйшыя гады будаўніцтва саюзу будзе прытармажанае ў сувязі з выбарчымі кампаніямі ў Расеі.

Прыняцьце Канстытуцыйнага акту саюзнай дзяржавы Лукашэнка ізноў адклаў на «сьвятое ніколі», бо «Расея ня хоча і не гатова ісьці на больш сур'ёзныя дачыненьні ў саюзным будаўніцтве». Ён параіў адкрыць канстытуцыйную дамову і пачытаць, а пасьля ўбачыць, хто і што там тармозіць.

Прагучала і заява аб фармаваньні новай сяброўскай дугі Беларусі, якую складуць Вэнэсуэла, Паўднёвая Афрыка, Малайзія, Віетнам, Кітай і арабскія краіны.

Разам з тым прагучалі патэтычныя заявы кшталту таго, што беларусы гатовыя паміраць за Расею, калі спатрэбіцца. Лукашэнка яшчэ раз выступіў у абарону іранскай ядравай праграмы. Ён чарговы раз выступіў супраць дамінаваньня беларускай мовы над расейскай і ўпэўніў, што не зьбіраецца ствараць партыю ўлады.

У цэлым выступ прайшоў у клясычнай стылістыцы старанна падрыхтаванага экспромту.

**Зьміцер Панкавец**

# Мілінкевіч узначаліць камітэт «За свабоду Дашкевіча»

Тым часам пракуратура паспыняла справы супраць іншых лідэраў «МФ».

На мінулым тыдні Сяржук Лісічонак атрымаў з пракуратуры паведамленьне аб спыненьні супраць яго крымінальнай справы паводле артыкулу 193 ч.1 аб удзеле ў дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі. Паведамленьне падпісанае начальнікам аддзелу рэспубліканскай пракуратуры М.Гардыкам. Такі самы ліст дакладна атрымаў Алег Корбан.

Супраць іх, а таксама Зьмітра Дашкевіча крымінальная справа была заведзеная яшчэ ў сакавіку. Яе распачаў камітэт па барацьбе з тэрарызмам КДБ разам з пракуратурай. З таго моманту па ўсёй Беларусі прайшлі дзясяткі допытаў актывістаў. Цяпер гэтая справа падышла да свайго фіналу: у суд перадаюць дакумэнты аднаго Дашкевіча.

Дашкевіча будуць судзіць у Кастрычніцкім судзе Менску, куды перадалі ўжо ягоную справу. Як вынікае са Зьмітровых лістоў на волю, ён пачаў знаёміцца зь яе матэрыяламі.

Нагадаем, што Дашкевіча арыштавалі 15 верасьня, калі ён разам са сваім адвакатам прыйшоў на допыт у пракуратуру, растлумачыўшы зьмену стрыманьня тым, што Зьміцер не зьяўляўся на допыты і не жыве ў месцы прапіскі ў Старых Дарогах. З таго часу Дашкевіч знаходзіцца ў СІЗА на вул.Валадарскага. Яму пагражаюць два гады зьняволеньня.

Чаму спынілі справы супраць іншых актывістаў? Лісічонак мяркуе, што абвінаваўчы бок ня змог сабраць доказнай базы. «Супраць Дашкевіча зрабіць гэта было лягчэй, бо ён быў публічным чалавекам, не цураўся зносінаў з журналістамі». Ёсьць і іншае меркаваньне: улада баіцца рабіць зь юнакоў герояў. Яна імкнецца запалохваць, але пазьбягае чапаць. Арышт Дашкевіча быў проста пытаньнем захаваньня твару: як бы ўсё выглядала, каб справа была, а выніку — пшык?

Тым часам падпольны «Малады фронт» мяркуе распачаць кампанію ў абарону Дашкевіча з патрабаваньнем вызваліць яго. Юнакі маюць праводзіць вулічныя акцыі, вывешваць расьцяжкі. На мінулым тыдні ў арганізацыю ўступіла вядомая актывістка Крысьціна Шацікава. Яна растлумачыла свой крок як знак салідарнасьці з Дашкевічам.

У чацьвер а 14:00 ва ўправе БНФ мае адбыцца паседжаньне аргкамітэту «За свабоду Дашкевіча». Старшынём аргкамітэту стане Аляксандар Мілінкевіч. Усю ж каардынатарскую дзейнасьць будзе выконваць Сяржук Лісічонак.

**Зьміцер Панкавец**

# Вада ў калене

Ці трэба спаборнічаць з уладай у патрыятызьме? Піша **Віталь Тарас**.

## Крывая ўсьмешка

Кінарэжысэр Юры Хашчавацкі і журналістка Ірына Халіп на сайце «Хартыя-97» зьедліва пракамэнтавалі чарговы «прывоз» прадстаўнікоў расейскіх рэгіянальных мэдыяў на сустрэчу з Аляксандрам Лукашэнкам у Беларусь. Маральны вэрдыкт у дачыненьні да журналістаў, чые «камандзіровачныя» загадзя аплачвае беларуская дзяржава, быў вынесены яшчэ да прэсавай канфэрэнцыі Лукашэнкі ў Менску і адпаведна — да зьяўленьня публікацыяў на гэтую тэму ў расейскім друку. І абсалютна слушна вынесены. Бо вынік сустрэчы і тое, як яна будзе асьвятляцца ў большасьці расейскіх выданьняў, сапраўды можна было прадбачыць загадзя.

Дрэнна тое, што і рэакцыя беларускіх недзяржаўных СМІ на выказваньні кіраўніка дзяржавы была цалкам традыцыйная і прадказальная. Усе ягоныя «ўдарныя цытаты» імгненна тыражаваліся амаль усімі інтэрнэт-выданьнямі, у тым ліку апазыцыйнымі, ды яшчэ шырока абмяркоўваліся ў блогах.

Такім чынам, тыя, хто не паглядзеў БТ у пятніцу ўвечары, змог паслухаць ягоны маналёг па радыё — беларускім альбо замежным. Таму, хто ўвогуле ніколі не глядзіць тэлебачаньня, ня слухае радыё і не чытае газэт, усё адно давялося пазнаёміцца з сэнтэнцыямі пра «разрыў стасункаў з Расеяй» і беларускую мову, якую можна вывучыць за паўгадзіны, пачытаўшы кніжку…

Гаворка не аб тым, што інфармацыйныя сайты ня мусяць трансьляваць альбо цытаваць кіраўніка дзяржавы. Інакш яны не называліся б інфармацыйнымі. Але ж і абмежавацца канстатацыяй гэтага факту ўжо не выпадае. Дванаццаць гадоў таму пэрліны аратарскага мастацтва кшталту «беларускі народ будзе жыць кепска, але нядоўга» выклікалі ў журналісцкай публікі здаровы рогат. За прамінулы пэрыяд некаторыя адмыслоўцы ўмудрыліся выдаць цэлыя тамы накшталт поўнага збору Лукашэнкавых цытат.

Зь цягам часу, аднак, анэкдатычныя выказваньні пачалі выклікаць у публікі крывыя ўсьмешкі. Цяпер яны здольныя выклікаць у многіх, у лепшым выпадку, глухое раздражненьне. Але справа, зноў жа, не ў эмоцыях.

## Альцгаймэр і іншыя

Дасьведчаныя палітолягі тлумачаць нам, што ўсе гэтыя выказваньні: і пра Скарыну ў Піцеры, і пра супольнае «гніеньне ў акопах», і пра «нацыяналістычнае ахвосьце» — прызначаныя не беларускай апазыцыі, не айчынным інтэлектуалам, але зусім іншай публіцы. Патэнцыйным палітычным хаўрусьнікам у Расеі ды расейскаму электарату, напрыклад. Тое, што прамовы кіраўніка дзяржавы ня нам прызначаныя і «не пра нас», — відавочна. Апазыцыя ў цяперашнім стане, пазбаўленая голасу, ня можа адказаць на абвінавачаньні й паклёп, прамоўленыя з высокай трыбуны. У лепшым выпадку яна можа чарговы раз зьвярнуцца на сваіх сайтах да ўлюбёнай тэмы «псыхіятрычнай экспэртызы». Інакш кажучы, ужываецца старажытная формула палемікі: сам дурны!

Пошукі ў Інтэрнэце архіўных мэдыцынскіх заключэньняў малавядомага экспэрта ў справе дыягназу пэўнай асобы нагадвае сада-мазахізм. Не дастаткова ведаць, што кіраўнік тыраніць сваіх падначаленых, трэба пераканаць сябе і астатніх, што ў кіраўніка хвароба Альцгаймэра, паркінсанізм, параноя, маніякальна-дэпрэсіўны псыхоз, дыярэя, ну, і на завяршэньне яшчэ «вада ў калене».

Як быццам кубінскім дысыдэнтам лягчэй ад таго, што ў Фідэля Кастра выразалі частку кішачніка, што ён стаў падобны да жывога шкілету і што ў яго зьявіліся прыкметы паркінсанізму.

Але ж народ любіць свайго правадыра. Паспрабуйце давесьці адваротнае яму, правадыру.

Эпоха позьняга Брэжнева была яшчэ і эпохай гамэрычнага рогату. Рагаталі над ягоным шамканьнем («сіські-масіські» ў Брэжнева азначала: «систематически»), над прышпільваньнем сабе ўсё новых ордэнаў, над тым, як ён цалаваўся «ўзасос» з Хонэкерам, Кастрам і Чарненкам. Рагаталі яшчэ і таму, што адчувалі — іхны час, час «крамлёўскіх старых», сыходзіць.

Калі тыя ж людзі, што раней сьмяяліся над анэкдотамі пра Брэжнева, пачынаюць казаць, што пры Брэжневе жылося няблага і што ўвогуле шкада вялікую дзяржаву СССР, якую невядома хто разваліў, становіцца ўжо не да сьмеху. Асабліва калі замест Брэжнева мы маем справу са значна больш маладымі й прагнымі да ўлады лідэрамі.

Нядаўна ў Нямеччыне выйшла кніга, дзе ўпершыню зробленая спроба прааналізаваць папулярныя анэкдоты, якія перадаваліся з вуснаў у вусны пры Гітлеру. Так, і ў Трэцім Райху, як высьвятляецца, распавядалі анэкдоты (так што ня ўсё было кепска ў Нямеччыне пры Гітлеру). І там можна было дастаць за гэта тэрмін у канцлягеры. Праўда, большасьць іх зь цягам часу ўжо не падаецца вельмі сьмешнай. Але адзін з тых, што цытаваліся нядаўна ў рэцэнзіі, апублікаванай у нямецкім друку, падаецца не анэкдотам, а рэальнай замалёўкай, сьпісанай з сучаснай беларускай рэчаіснасьці.

У «жоўты дом» прыяжджае Гёрынг. Адміністрацыя, ведаючы загадзя пра візыт, доўга і ўпарта трэніруе пацыентаў, каб яны сустрэлі фэльдмаршала адпаведным чынам. Нарэшце Гёрынг прыяжджае, ўскідае руку ў нацысцкім вітаньні, ўсе вар'яты, пашыхтаваныя ў шэрэнгу, дружна салютуюць у адказ: «Гайль Гітлер!» І толькі нейкі чалавек, стоячы крыху ўбаку, не ўзьнімае рукі. «Чаму вы не салютуеце?» — зьдзіўлена пытаецца ў яго Гёрынг. «Дык я ж не вар'ят», — чуецца ў адказ.

## Не крычы «Ваўкі!»

Ёсьць рэчы, якія, падобна жартам, немагчыма растлумачыць. Немагчыма дый ня трэба тлумачыць антысэмітам, што пратаколы сіёнскіх мудрацоў — гэта бздуры і што юдэі ня п'юць крыві хрысьціянскіх немаўлят.

Навошта апазыцыі ўвесь час даводзіць


Тема: Новости портала TUT.BY

TUT.BY БЕЛОРУССКИЙ ПОРТАЛ

Беларусь СНГ Новости Каталог Вакансии Объявления Предприятия

29 сентября 2006

ПОЛИТИКА

- Заседание Совета глав государств СНГ состоится 17 октября в Минске
- Президент Беларуси не намерен создавать партию власти
- Вопрос о введении экономических санкций ЕС в отношении Беларуси, возможно, будет рассмотрен 12 октября
- Лукашенко СССР в мини-формате не строит
- Лукашенко: Мы против Конституционного акта, который будет слабее договора о Союзном государстве
- Беларусь избрана на пост вице-председателя комитета по экономическому сотрудничеству и интеграции ЕЭК ООН
- Лукашенко: Союз с Россией является приоритетом политики Беларуси
- Лукашенко: "Мы переживем" возможное лишение Беларуси торговых преференций
- Лукашенко: Беларусь никогда не станет частью России
- Лукашенко: Может быть, и правильно диктатором назвали
- Президент Беларуси: Дай Бог, чтобы всегда была такая оппозиция у Лукашенко, как сейчас
- Лукашенко предлагает сохранить СНГ в качестве политического клуба
- Лукашенко заявляет о намерении разорвать союзные отношения с Россией в случае значительного повышения стоимости российского газа для Беларуси

ЭКОНОМИКА И БИЗНЕС

- Сдаются в долгосрочную аренду производственно-складские помещения
- Экономист: Отсутствие Беларуси в рейтинге глобальной конкурентоспособности - сигнал руководству страны
- Лукашенко: Рыночная стоимость "Белтрансгаза" составляет 5 млрд. долларов

уладам, што яна не такая кепская, як пра яе гаворыць прапаганда? Што яна, апазыцыя, ня менш патрыятычная, як улада? Ужо ня толькі кіраўніку дзяржавы, але ж і маладасьведчаным людзям стала зразумела, што ў блізкім часе ня будзе рэфэрэндуму наконт аб’яднаньня Беларусі й Расеі, бо для Масквы гэта занадта рызыкоўны экспэрымэнт. Што ўсе карты ў выпадку такога рэфэрэндуму будуць на руках у кіраўніка беларускай дзяржавы. Гэтаксама не патрэбны ён і беларускаму боку. Шантажаваць Маскву саюзьніцтвам зручней нават і без рэфэрэндуму. А навошта на яго траціць грошы зь бюджэту, калі можна наўпрост зьвярнуцца да крамлёўскага кіраўніцтва і расейскага электарату з дапамогай тых самых расейскіх СМІ?

Чаго дамаглася апазыцыя, некалькі разоў запар уздымаючы пытаньне аб нібыта непазьбежнасьці аб’яднальнага рэфэрэндуму і заклікаючы Захад бараніць незалежнасьць Беларусі?

Успамінаецца старая прыпавесьць, якая атрымала шырокую вядомасьць у літаратурнай апрацоўцы Лява Талстоя. Хлопчык, які пасьвіў авечкі, некалькі разоў пачынаў лямантаваць: ваўкі! Кожнага разу зьбягаліся сяляне з косамі ды сякерамі, але паколькі ваўкоў не было, яны разыходзіліся. Нарэшце, калі ваўкі сапраўды напалі на статак, ніхто на лямант малога пастуха не зьвярнуў увагі…

Незалежна ад таго, ці пагражаюць у рэальнасьці «ваўкі» Беларусі, апазыцыю ўжо цяпер ніхто ня чуе, акрамя яе самой. З гледзішча абывацеля, усё адно Лукашэнка больш дбае пра інтарэсы незалежнай Беларусі, чым Мілінкевіч зь Лябедзькам і Калякіным разам узятыя. Бо ў іх няма магчымасьці й жаданьня шантажаваць Крэмль. А ў яго ёсьць. Мілінкевіч можа сустракацца з выдатнымі эўрапейскімі палітыкамі і гаварыць па-француску на розныя высакародныя тэмы, а Лукашэнка ня можа. Ды яму гэтага й ня трэба. Яму дастаткова расейскай мовы.

А ўсё, што трэба дыктатару, як заўсёды, зробяць за яго іншыя. Сытуацыя з Фондам Каліноўскага, утворанага ў самых лепшых мэтах, каб дапамагчы рэпрэсаваным беларускіх студэнтам скончыць адукацыю ў Польшчы, дзякуючы паводзінам некаторых ня надта разумных студэнтаў, дапамагае ўладзе дыскрэдытаваць і сам фонд, і яго заснавальнікаў, і апазыцыю наагул.

Спрэчкі пра тое, якім чынам і ў якіх варунках апазыцыя павінна падтрымаць вышэйшае кіраўніцтва дзяржавы, каб абараніць сувэрэнітэт краіны, здольныя выклікаць у лепшым разе зьдзіўленьне. Хіба яшчэ ня ясна, што апазыцыя меней за ўсё патрэбная Лукашэнку ў справе ўмацаваньня сваёй дзяржавы? Ён гэта чарговым разам давёў падчас сваёй прэсавай канфэрэнцыі ў Менску. Галоўнае слова тут — *сваёй* (дзяржавы). Той, якая патрэбна менавіта Лукашэнку, а не апазыцыі і не беларускім інтэлектуалам, не беларускаму народу. У гэтай ягонай дзяржаве няма й ня будзе свабоды слова. Больш за тое — у ёй ня будзе беларускага слова ўвогуле. І, адпаведна, ня будзе беларускага народу. Перафразуючы Сталіна: няма народу — няма праблемы.

Замест таго, каб будаваць *сваю* беларускую дзяржаву: выпускаць беларускую прэсу, беларускія кніжкі й падручнікі, ствараць свае лятучыя ўнівэрсытэты, беларуская апазыцыя ўвязалася ў бясконцую й бясплённую спрэчку з уладай, у гульні ў выбары й легітымнасьць. Хто зь іх лепшы? Лепшы для абывацеля заўсёды той, хто пры ўладзе. Дзеля таго, каб заваяваць уладу, не дастаткова крытыкаваць ці нават высьмейваць праціўніка. Трэба спачатку пераканаць саміх сябе, што мы жывем у сваёй краіне, а значыцца — праўда на нашым баку.





Новая кніга Валера Булгакава

Чакаюцца таксама беларускае і ангельскае выданьні.

пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў

# «Шмат малых мурашоў і ніводнага вялікага»

Лідэр аб’яднананых дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч у панядзелак паведаміў, што «бярэ на сябе адказнасьць за рух «За свабоду», які ўтварыўся адразу пасьля выбараў. А.Мілінкевіч заявіў, што «палітрада дэмсілаў не змагла рэалізаваць патэнцыял руху, засяродзіўшыся на сваіх праблемах». Фактычна, А.Мілінкевіч тым самым прызнаў, што стварыць новы адзіны рух пратэсту ня ўдасца, і бярэцца арганізаваць уласны рух як роўны сярод роўных. Што думаюць людзі пра такую ініцыятыву А.Мілінкевіча?

Палітоляг **Юры Чавусаў:** «Такі крок сасьпеў яшчэ ўвесну, калі грамадзянская актыўнасьць беларусаў была на вельмі высокім узроўні, а цяпер час сышоў. Папросту ўсім, у тым ліку Мілінкевічу, надакучылі бясконцыя палітычныя раздраі ў кааліцыі, утварэньне нейкіх груповак. Лібэралы з аднага боку, зь іншага нацыяналісты і сацыялісты і г.д. Мілінкевіч пайшоў на такі крок толькі пасьля таго, як меў сустрэчы з актывістамі руху «За свабоду» ў рэгіёнах. Людзі сапраўды чакалі ад яго гэтага, але значна раней. Мілінкевіч мог заняць пазыцыю «ангельскай каралевы», пазіраючы на ўсё што робіцца звысоку, але не зрабіў гэтага. Напярэдадні мясцовых выбараў трэба зноў працаваць, бо мінулыя выбары ўжо сышлі ў нябыт, а досьвед, на жаль, не назапашваецца».

Юры Чавусаў: Людзі чакалі гэтага, але значна раней.

Дэмакратычны актывіст з Барысава **Зьміцер Бародка:** «Найлепш, каб рух «За свабоду» трансафармаваўся ў грамадзянскую кампанію, бо людзям якраз падабаецца такая апалітычная назва. Народ у рэгіёнах гатовы працаваць дзеля Беларусі, яны кажуць, прыйшлі змагацца за сваю краіну і ім, у прынцыпе, бяз розьніцы, хто стаіць ля штурвала. Яны не чакаюць нейкіх указак зьверху, а дзейнічаюць самі».

Намесьнік старшыні ПКБ **Валер Ухналёў**: «Тое, што Мілінкевіч вырашыў стварыць свой рух, не замінае існаваньню дэмакратычнай кааліцыі, тым болей што сам Мілінкевіч не зьбіраецца пакідаць лідэрства ў ёй. Проста прыйшоў час больш актыўных дзеяньняў. Наконт руху «За свабоду» мы маем узгодненую пазыцыю ў рамках дэмакратычнай кааліцыі, мы пазытыўна ставімся да яе існаваньня. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у палітыку, грамадзкую дзейнасьць прыйшло багата людзей, якія не зьбіраюцца ўступаць у ніводную партыю, для такіх і існуе рух «За свабоду».

Зусім іншае меркаваньне мае рок-музыка, лідэр гурту *Neuro Dubel* **Аляксандар Кулінковіч**: «Мяне засмучае, што апошнімі месяцамі робіцца ў нашай апазыцыі. Адзінае, што адбылося добрае ў ейных шэрагах — гэта абраньне лідэра. Цяпер жа працягваюцца і множацца ранейшыя пучкі, ускрыкі і заляцаньні. Гэта ўсё адштурхоўвае простых людзей, яны ставяцца да апазыцыі несур’ёзна, бо ў ёй няма адзінства, няма маналіту. У нашай апазыцыі шмат малых мурашоў, але няма аднаго вялікага, які б быў здольны павесьці яе за сабой, каб яе сур’ёзна ўспрынялі ня толькі простыя людзі, але і ўлады. Цяпер жа са стварэньнем гэтых рухаў і кампаній апазыцыя вяртаецца да старога, а яно, як вядома, ні да чога добрага не прывяло».

**ЗП**

# Мілінкевіч застаецца лідэрам апазыцыі



У панядзелак ад ранку інфармацыйная агенцыя «Тэлеграф» і «Беларускі партызан» паведамілі, што бліжэйшым часам А.Мілінкевіч можа адмовіцца ад абавязкаў лідэра аб’яднанай апазыцыі і засяродзіцца на руху «За свабоду».

Прэс-сакратар Мілінкевіча Павал Мажэйка адказаў, што падобных заяваў яны не рабілі і ўвогуле не разумеюць, адкуль маглі зьявіцца такія чуткі. «Гэтую дэзу маглі кінуць як нашы канкурэнты, гэтак і спэцслужбы», — кажа сп.Мажэйка.

«Пакуль існуе кааліцыя і пакуль я абраны яе лідэрам, я не зьбіраюся нікуды сыходзіць зь яе», — заявіў А.Мілінкевіч. Ён паведаміў таксама, што пры канцы лістапада мае адбыцца форум «За незалежнасьць», які мае сабраць прадстаўнікоў усіх дэмакратычных сілаў.

**Зьміцер Панкавец**

**Вестка пра фармаваньне руху «За Свабоду» выклікала водгукі чытачоў сайту «НН». Вось сія-тыя з рэплік**

**Яўген Мурашка напісаў Кастрычнік 3, 2006 у 0:41**
Што тычыцца Мілінкевіча і ягоных крытыкаў, то ён за тры месяцы пасьля выбараў зрабіў болей, чым вы за 12 гадоў. Дзякуючы яго намаганьням сёньня маладым беларускім патрыётам адчыненыя дзьверы ВНУ ўсёй Эўропы. І гэта яго запрашае Фінляндыя, а ня вас. Таму не чапайце А.Мілінкевіча.

**Залеўскі напісаў Кастрычнік 3, 2006 у 10:24**
Відаць, сапраўды Мілінкевічу дапякло. Цешыць, што спадар Алесь рашыўся на такі крок. То бок мае палітычную волю. Але што на гэта адкажуць нашыя «амбітна–выбітныя» лідэры — вось што пужае найболей.

**Саянов напісаў Кастрычнік 3, 2006 у 11:55**
Рух «За Свабоду» — чарговая пустышка, якая здольная адно толькі безвынікова «выпусьціць пару» з пратэстнай часткі насельніцтва Беларусі.

**Пульша напісаў(ла) Кастрычнік 3, 2006 у 23:27**
У нас ужо ёсьць людзі, што зусім спакойна займаюцца самвыдатам і ня парацца з гэтай нагоды. «Свабода» пачала выходзіць у самвыдаце. У нас ёсьць і іншыя чалавекі. «Што тычыцца Мілінкевіча і ягоных крытыкаў, то ён за тры месяцы пасьля выбараў зрабіў болей, чым вы за 12 гадоў…». — А во гэта — факт!»

# Польскіх ксяндзоў вымушаюць зьехаць

Улады пераходзяць да высылкі ксяндзоў.

Сямёра ксяндзоў з Польшчы, якія служаць у Гарадзенскай дыяцэзіі, не атрымалі згоды на працяг працы ў наступным годзе. Дазволу не атрымалі таксама пяць польскіх законьніц.

«Ксяндзы працуюць у парафіях да канца году. Аднак прыйшоў нэгатыўны адказ на пададзеную ў чэрвені просьбу аб працягу дазволаў на наступны год. Курыя падала скаргу ў камітэт па справах рэлігіяў і нацыяльных меншыняў, што выдае тыя дазволы. Чакаем адказу», — кажа кіраўнік справаў біскупскай курыі ў Горадні, ксёндз Антоні Грэмза.

У нядзелю ў касьцёлах на Гарадзеншчыне быў зачытаны ліст Гарадзенскага біскупа а. Аляксандра Кашкевіча з заклікам да малітвы ў справе законьніц польскіх і ксяндзоў, якія не атрымалі згоды на далейшую працу. Вернікі зьбіраюць подпісы за іх. У Гарадзенскай дыяцэзіі каля 170 парафіяў, ксяндзоў з Польшчы там служыць амаль 70. Агулам з 354 каталіцкіх сьвятароў у Беларусі 170 — замежнікі, у большасьці палякі.

**Паводле Gazeta.pl**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## «НН» адмовілі ў залі

У мінулым нумары «НН» мы паведамлялі, што Вялікая вечарына беларускай паэзіі, зь якой мела распачацца сьвяткаваньне 100-годзьдзя «Нашай Нівы» ў Менску, адбудзецца ў Вялікай залі Дому літаратара. А не ж.

2 кастрычніка а 12-й у Рэдакцыю затэлефанаваў дырэктар Дому літаратара Часлаў Праваловіч. Ён паведаміў, што, насуперак папярэдняй дамоўленасьці, ня можа даць залі Дому літаратара 5 кастрычніка для правядзеньня вечарыны. Ч.Праваловіч матываваў адмову тым, што там мае быць вячэрні спэктакль Тэатру беларускай драматургіі. Аднак у згаданым тэатры карэспандэнту «НН»




паведамілі, што акурат 5 кастрычніка спэктаклю ў Доме літаратара няма.

У выніку імпрэза такі адбудзецца, але ў іншым месцы — канфэрэнц-залі Палацу мастацтваў (вул.Казлова, 3) а 19-й.

Стогадовы юбілей «НН» ужо адзначаны ў Бэрліне. У Літве юбілей будзе адзначацца на дзяржаўным узроўні. А вось для цяперашняе беларускае адміністрацыі 100-годзьдзе «НН», відаць, непажаданае. Гэта толькі пацьвярджае: курс на дыскрымінацыю беларускай культуры застаецца нязьменным.

**СМ**

## Іванюковіча аштрафавалі на 112 даляраў

**Завяршыўся судовы працэс у Маскве над Юрасём Іванюковічам, які напісаў на шыльдах пасольства Беларусі ў Маскве «Жыве Беларусь!» і «БТ хлусіць!». Беларуса аштрафавалі на 3 тыс. расейскіх рублёў (112 даляраў ЗША) замест запатрабаваных абвінаваўцам 20 тысяч. Прысуд быў вынесены за вандалізм паводле крымінальнага артыкулу. Працэс цягнуўся каля трох месяцаў, судовыя паседжаньні ўвесь час пераносіліся з-за адсутнасьці ў Маскве беларуска-расейскага перакладчыка.**

**АК**

## Вацлаў Гавал: Прыём Украіны й Беларусі мусіць стаць вянцом стварэньня Эўразьвязу



ZPRAVY.IDNES.CZ

У нядзельным інтэрвію тэлебачаньню Чэхіі, сярод іншага, Вацлаў Гавал адказваў і на пытаньні аб будучыні Эўразьвязу. На думку экс-прэзыдэнта Чэхіі, перш за ўсё неабходна вызначыць цывілізацыйную мяжу, на якой пашырэньне завершыцца. Гавал мяркуе, што яна ляжыць між Расеяй і Беларусьсю.

**Карэспандэнт:** Чаму апошнім часам эўраскептыкі сталі выступаць за пашырэньне ЭЗ?

**Гавал:** Яны хочуць бачыць Эўразьвяз бяззубым, як будзе ён бясконца пашырацца, дык стане нейкай другой непатрэбнай ААН. Зьвяз мусіць вызначыцца ў каштоўнасьцях, якія вызнае, каго можа прыняць, а каго не. Так, Расея — краіна, якая цягам стагодзьдзяў ня ведае, дзе яна пачынаецца і дзе сканчаецца, і ад гэтага ўзьнікаюць бясконцыя праблемы. Браць гэта за ўзор ЭЗ ня варта.

Балканскія краіны Сэрбія, Албанія, калі б туды хацелі, калі б выканалі ўмовы, павінны да яго (ЭЗ) належаць, як і Беларусь і Украіна. Але далей пачынаецца іншае кола цывілізацыі, іншы сьвет, які павінен мець гарманічныя сувязі з гэтым. Гарманічным гэтае дачыненьне будзе толькі ў тым выпадку, калі будзе ясная мяжа, дзе адзін сьвет сканчаецца, а другі пачынаецца.

**Радыё «Свабода»**

## Нілу Гілевічу – 75


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

30 верасьня споўнілася 75 гадоў народнаму паэту Беларусі Нілу Гілевічу. Ён нарадзіўся ў 1931 г. у вёсцы Слабада на Лагойшчыне, аўтар мноства лірычных зборнікаў, песьняў, перакладаў, раману ў вершах «Родныя дзеці», вядомы навуковец-фальклярыст. Дзякуючы Гілевічавым перакладам, да нас прамаўляюць украінскія, баўгарскія, сэрбскія, лужыцкія і іншыя паэты сьвету. Рэдакцыя далучаецца да віншаваньняў і жырыцца, што юбіляр катэгарычна адмаўляецца ад інтэрвію. Калярытныя мэмуары Ніла Гілевіча можна прачытаць у апошніх нумарох часопісу «Дзеяслоў».


МІКАЛАЙ ХАЛЕЗІН

# N.R.M. у Стакгольме

26 верасьня ў прэстыжнай залі Стакгольму *Elverket* з посьпехам прайшоў канцэрт гурту *N.R.M.* Заля была поўная. Сярод слухачоў былі швэды, беларусы рознага веку: ад прадстаўнікоў старой дыяспары да моладзі, што гадавалася на музыцы Лявона. Тры беларусачкі прыехалі на канцэрт адмыслова зь Лёндану. Абвестка пра канцэрт зьявілася ў найбуйнейшай газэце Стакгольму *Stockholm City*.

На канцэрце *N.R.M.* слухачам прапанавалі праграмку з тэкстамі сьпеваў гурту на швэдзкай мове — перакладзеныў іх у швэдзкую кіраўнік аддзяленьня пасольства Швэцыі ў Менску Стэфан Эрыксан.

Апрача *N.R.M.*, у канцэрце ўзяла ўдзел Руся — фантастычная сьпявачка з гурту «Індыга» зь песьняй «Чыстая, сьветлая». Лявон выканаў на біс свае гіты, між іншым, «Лёгкія-Лёгкія», і новую філязофскую песьню «Мінск-Менск». Панавала сьвяточная атмасфэра, лунал нацыянальныя сьцягі. Швэдзкія прадусэры зазначылі, што жадаюць запрасіць *N.R.M.* зноў.

Перад канцэртам Вольскі даў інтэрвію радыё «Швэцыя». Лявон, між іншым, зазначыў: «У маёй краіне моладзь змагаецца за нешта значна больш сур'ёзнае, чымся заходні моладзевы рух супраць «Макдоналдсу».

**Андрэй Катлярчук**

# Беларусы

У 2007 годзе беларускі ўрад мяркуе пачаць навуковыя працы ў Антарктыдзе.

Гэты мацярык празь лёдавае покрыва і холад мала дасьледаваны. Антарктыда мае вялікія запасы нафты, газу, мэталаў і іншых карысных выкапняў, з такіх пазыцыяў праца беларускіх навукоўцаў карысная і патрэбная.

Беларусы будуць вывучаць газавыя і аэразольныя кампанэнты атмасфэры. Суайчыньнікі разьмесьцяцца ў раёне гары Вячэрняя на ўзьбярэжжы мора Касманаўтаў. Базай будзе станцыя, якую расейцы перадалі беларусам бясплатна. Яна месьціцца ў 14 кілямэтрах ад расейскай станцыі «Моладзевая» і мае такую самую назву.

Тая станцыя апошнія гады знаходзіцца ў закансэрваваным стане. Нават у інстытуце фізыкі НАН цяпер ня веда-

# Алег Трусаў: «Інструкцыя Радзькова – гэта не дэкрэт прэзыдэнта»

Кіраўніцтва Таварыства беларускай мовы зьвярнулася зь лістом да прэм'ер-міністра, у якім заклікае адмяніць рашэньне Міністэрства адукацыі аб пераводзе выкладаньня гісторыі і геаграфіі на расейскую мову.

На думку кіраўніка ТБМ Алега Трусава, адмена гэтага рашэньня не запатрабуе складаных працэдурных мерапрыемстваў. Зь ягоных словаў, збор подпісаў дае свой плён. Так, у Лідзе мясцовыя ўлады пастанавілі пакінуць выкладаньне гісторыі Беларусі пабеларуску. А вось менскія ўлады апэлююць да распараджэньня міністра Радзькова, — журыцца А.Трусаў. Таму кіраўніцтва ТБМ зьвярнулася зь лістом да міністра Радзькова, у якім даводзіць, што канчатковае слова ў вырашэньні моўнага пытаньня мусіць быць за настаўнікамі-прадметнікамі, вучнямі і іх бацькамі. А.Трусаў з аптымізмам зазначае, што прайшлі тыя часы, калі ў такія моманты ўсе чакалі на ТБМ: «Цяпер людзі самі распачынаюць збор подпісаў ці ладзяць акцыі пратэсту». Прыкладам такой самаарганізацыі сп.Трусаў назваў ініцыятыву берасьцейскіх настаўнікаў, якія жадаюць працягваць выкладаньне сваіх прадметаў па-беларуску, у зборы подпісаў. На яго думку, толькі збор подпісаў, калі ў адпаведную структуру дасылаецца пэрсанальны ліст, здольны прынесьці перамогу. Такія звароты грамадзянаў нельга пакінуць без адказу, бо гэта агаворана законам. «Я нават ведаю патрэбную лічбу: 50 тысячаў подпісаў вырашылі пытаньне беларусізацыі нашых электрычак».

**Сямён Печанко**

## Добрая навіна ў нумар

Газэта «Товарищ» выйграла суд супраць старшыні асацыяцыі «Сталічнае таксі» Ігара Верхаўца. Судзьдзя ня ўбачыла ў дзеяньнях газэты зьнявагі гонару й годнасьці і пры агалошваньні прысуду спаслалася на арт.33 Канстытуцыі, дзе гаворыцца, што кожны грамадзянін мае права выказваць свае меркаваньні.

**Зьміцер Панкавец**

# ў Антарктыдзе будуюць новую БелКУ

юць, ці ладзяцца на «Моладзевай» якія-кольвек работы. Нават калі станцыю зноў заэксплюатуюць, дык работы на ёй будуць ладзіцца безь зімовак: няма адпаведных умоваў.

Але ўласнай станцыі беларусы не зьбіраюцца будаваць, гэта немэтазгодна з эканамічнага гледзішча. Расейцы мусяць дапамагаць нашым вучоным з фрахтоўкай суднаў для дастаўкі паліва, абсталяваньня і прадуктаў. Разам з тым станцыя, перададзеная расейцамі, патрабуе значнай мадэрнізацыі.

Беларусь спрабуе ператварыцца ў сусьветную дзяржаву. Увадначас імкнецца эканоміць на кожнай дробязі. Да чаго прывяла такая эканомія ў выпадку зь БелКА — добра ведама. Ці ня будзе такога і ў Антарктыдзе?

**Зьміцер Панкавец**

WWW.HELIPRO.RU



**Нашы землякі разьмесьцяцца на ўзьбярэжжы мора Касманаўтаў.**

# Бульбе далі дзесяць сутак

У Беларусі бульба памокла, у Эстоніі ды Латвіі пасохла, а ў Азэрбайджане яе даядаюць мышы.

Сытуацыя з уборкай бульбы ў краіне нагадвае нядаўняе змаганьне за збожжавыя. Тыдзень таму кіраўнічка аддзелу вытворчасьці, перапрацоўкі і гандлю плодаагароднiннай прадукцыяй Мінсельгасхарчу Тацяна Карбановіч паведамляла пра пастаўленую міністэрствам задачу скончыць уборку другога хлеба да 5 кастрычніка, а таксама пра пляны сабраць ня менш за мільён тонаў бульбы. Днямі яна ж сказала, што дакопкі расьцягваюцца яшчэ на 10 дзён. Зьмянілася і лічба вераемнага ўраджаю — 820 тыс. тонаў.

Прычынаў пераносу канчатковага тэрміну Т.Карбановіч не паведамляе, адно выказвае заклапочанасьць надвор'ем, што пачынае псавацца.

На гэты момант сабрана 27,7 тыс. га, што складае 59,5% ад агульнай плошчы. Накапана 479 тыс. тон бульбы, сярэдняя ўраджайнасьць 173 ц/га.

Найбольшая ўраджайнасьць зафіксаваная ў Магілёўскай вобласьці — 226 ц/га, найменшая — у Віцебскай — 149 ц/га. На месцах аптымізму крыху меней. Бульба масава гніе — даецца ў знакі сырое лета. На Берасьцейшчыне і на Гарадзеншчыне людзі сумна жартуюць, што леташняя бульба выглядае лепей за маладую. Яшчэ кажуць, што бульба ў яблыкі перакінулася — амаль паўсюль назіраецца небывалы ўраджай яблыкаў.

Бяда з бульбаю сёлета напаткала ня толькі беларусаў. У Эстоніі недабор ураджаю складае каля 50%. Чакаецца падвышэньне коштаў на бульбу, уласных запасаў хопіць толькі да лютага, а на заплянаваны экспарт за мяжу трэба забыцца. Тут, як і ў суседняй Латвіі, іншая прычына неўраджаю — надзвычайная сьпёка. Эстонскія фэрмэры кажуць, што гэтым годам выйгралі толькі тыя, хто падбаў пра дажджавальныя прыстасаваньні.

А ў далёкім Азэрбайджане іншая трасца — нашэсьце палёвак, што значна пашкодзілі запасы ў сьвірнах і палявыя пасадкі бульбы. Такую зьяву тут назіраюць упершыню, і эфэктыўных захадаў не было зроблена. От таму ўраджай азэрбайджанскай бульбы і пад пагрозай.

**Сямён Печанко**



PHOTO.BYMEDIA.NET



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Табліца

Дзед з Полацку ў гасьцях у сіценцаў цікавіцца, хто пасяліўся ў інтэрнаце. «Хімік» — адказваюць вяскоўцы. «А, вучоныя прыехалі», — з разуменьнем хітае галавой дзед.

«Зычу табе хутчэй адолець гэтую *табліцу Мендзялеева*», — завяршае свой ліст чытачка «Нашай Нівы» зь Пінску.

«Хімія» — гэта насамрэч *пэрыядычная сыстэма элемэнтаў*. Крымінальныя й паўкрымінальныя элементы, што пэрыядычна трапляюць у сыстэму «абмежаваньня волі», складаюць упарадкаваную заканамернасьць сучаснага грамадзка-палітычнага жыцьця. Як спадчыну разьвітага сацыялізму, «хімію» ў Расеі й большасьці постсавецкіх краінаў ужо скасавалі. Але ж вось у Беларусі саўковую «табліцу Мендзялеева» дагэтуль штудыююць тысячы.

Сучасная беларуская «хімія» — кляндайк для крымінальніка-навучэнца. Тут прафэсійныя выкладчыкі дадуць яму поўнае ўяўленьне пра мэтады сымуляцыі з дапамогаю *ёду, жалезныя* паняцьці турмы й значэньні *цынку* (прастукваньне праз сьцяну). Тут навучаць, як перакрываць *кісларод* адміністрацыі ўстановы, як пазьбягаць ужываньня *брому* (дадаецца ў пітво ў ізалятарах і калёніях дзеля падаўленьня лібіда) і здабываць *высакародныя мэталы* ў кватэрах даверлівых грамадзянаў.

Сэрца крывёю абліваецца, калі бачыш гэтых хлопцаў, аднагодкаў ці крыху маладзейшых, — Пакаленьне «Маладога фронту»! — якія днямі слухаюць «блатны шансон» ды «таганку», размаўляюць на сумесі турэмнага жаргону й расейскага мату і лічаць гэта найвышэйшай рамантыкай. Іх сьвядомасьць ужо скалечаная дашчэнту. Мой 22-гадовы сусед з Новалукомлю шчыра абураўся: «Угон аўтамабіляў — гэта мой хлеб, мая праца, разумееш? Я працую ня менш за іншых — дык за што мяне пасадзілі?!»

Злосны неплацельшчык аліментаў зь недалёкае вёскі; полацкі нумізмат, у якога на выставе паспрабавалі скрасьці ягоныя манэты (крыўдзіцель апынуўся ў рэанімацыі, калекцыянэр — у Сітне); малады кіроўца, што зьбіў хлопчыка з роварам; жыхар Наваполацку, які ўтапіў у балоце дыпламат зь міліцэйскімі дакумэнтамі; лепельскі мужык, які ад рэўнасьці «вынес санкі» (зламаў сківіцу) жонцы; здаровы хуліган, на якога пасьля чарговае бойкі суседзі-пацярпелыя падалі заяву... Як і ў пэрыядычнай сыстэме элемэнтаў, тут ёсьць артыкулы *лёгкія* (аліменты, махлярства, п’янкі, выпадковы ўшчэрбак) і *цяжкія* (цяжкія цялесныя пашкоджаньні, ненаўмысныя забойствы): першыя часьцей падпадаюць пад амністыю ці ўмоўна-датэрміновае вызваленьне.

Мая «арганізацыя масавых беспарадкаў» робіць на «калегаў» моцнае ўражаньне. Даведаўшыся, што ў «беспарадках» на галоўнай плошчы сталіцы ўдзельнічала некалькі тысячаў чалавек, паглядзеўшы на машыны наведнікаў і пераканаўшыся, што пасlabленьняў у камэндатуры не даюць, яны прысьвістваюць і па-змоўніцку цісьнуць руку: «Трымайся!»

Ужо неаднойчы пераканаўся на «сутках», у ізалятарах, «адстойніках», на той жа

## ХРОНІКА

**26 верасьня**

Палітвязень **Сяргей Скрабец** абвясьціў галадоўку: ён пратэстуе супраць таго, што ягоныя дакумэнты не падаюць на датэрмінова-ўмоўнае вызваленьне.

Дакумэнты на датэрмінова-ўмоўнае вызваленьне палітвязьня **Міколы Статкевіча** былі падрыхтаваныя, але так і ня трапілі да суду.

Суд над актывістам непрызнанага Саюзу палякаў Беларусі **Мечыславам Яскевічам** перанесены на 4 кастрычніка, бо адвакат выклікаў дадатковых сьведкаў абароны.

У Магілёве забароненыя пікеты й мітынг з удзелам **Аляксандра Мілінкевіча**, які хацелі зладзіць грамадзкія актывісты. У Бабруйску актывістам БСДП(Г) не дазволілі ладзіць пікеты ў падтрымку палітвязьня **Аляксандра Казуліна**.

Мінʼюст накіраваў у Вярхоўны суд пазоў аб прыпыненьні дзейнасьці **ПКБ**.

Сябру «Моладзі БНФ» **Паўлу Краўчанку** затэлефанаваў дадому невядомы, які назваўся супрацоўнікам КДБ, і запрасіў для размовы ў Камітэт.

**27 верасьня**

Пінскі суд аштрафаваў актывіста ПБНФ **Аляксандра Аўсеенку** на 55 базавых велічыняў: яго зьвінавацілі ў незадэклараваным правозе тавараў (налепак і ўлётак!) праз мяжу. Першы раз яго аштрафавалі на 50 б.в., але абласны суд скасаваў рашэньне і загадаў перасудзіць. Другое паседжаньне адбылося без удзелу абвінавачанага.

Моладзеваму актывісту **Артуру Фінькевічу** кіраўніцтва магілёўскай спэцкамэндатуры адмовіла ў шпіталізацыі, не зважаючы, што ў хлопца тэмпэратура паднялася да 39 градусаў.

**ГА «БАЖ»** накіравала міністру інфармацыі зварот з просьбай зьняць забарону на выхад часопісу **«ARCHE»**.

Віцебскія ўлады не далі дазволу на **мітынг «За незалежнасьць Бела-**

# Мендзялеева

«хіміі»: да «палітычных» у месцах пазбаўленьня ці абмежаваньня волі ставяцца з выключнай павагай. Прынцыповасьць, адукаванасьць і беларуская мова — візытоўка «палітычных» — вітаецца зваротна прапарцыйна непрыязнасьці да гэтых рысаў у афіцыйных установах навукі, культуры й адукацыі. Прыхільнікаў Лукашэнкі сярод сядзельцаў не сустракаў: тут улада — ненавісны апарат падаўленьня. Слова «рэжым» выклікае тыповую *хімічную* рэакцыю. У крымінальнага інтэрнацыяналу ёсьць нават адпаведная клясыфікацыя РБ — «чырвоная (г.зн. кантраляваная адміністрацыяй) рэспубліка». Дзіва што сымпатыяў да міліцыі тут яшчэ меней, чым сярод удзельнікаў вулічных маніфэстацыяў. Можаце сабе ўявіць, якім попытам карыстаюцца ў «мясьцінах ня надта аддаленых» значкі «За свабоду!».

Разам з тым «папраўчая ўстанова адкрытага тыпу», як ніводная іншая структура пэнітэнцыярнай сыстэмы, *не папраўляе*, а горшыць чалавека. Для «навенькіх» гэта асяродак страшэннага разлажэньня, а для злачынцаў — паўсюдная спакуса: за мінімальным кантролем выпіць, пабалдзець, а заадно і «выхаваць маладняк» — не праблема. І канвэер працуе: «Скраў, выпіў — у турму».

За год у Малым Сітне праз мой інтэрнацкі пакой прайшло 14 «хімікаў». Чацьвёра зь іх сустрэліся ў адной камэры ў Віцебскай калёніі (даведалася тутэйшая жанчына, якая возіць перадачы майму былому суседу). Здавалася б, чаму б тым небаракам не адбыць свой тэрмін ціха й спакойна... Але сыстэма працуе як гадзіньнік: прымусовая праца зранку + адносна вольны вечар = начная п’янка + пахмельле назаўтра. Пошукі выпіўкі, хованкі на працоўным месцы, сваркі й скандалы працягваюцца да тае пары, пакуль камэндантка інтэрнату ці майстры на працы ня выклічуць «эвакуатараў» з камэндатуры. «Хімікі» добра ведаюць, што Мендзялееў вынайшаў ня толькі пэрыядычную сыстэму, але й рэцэпт расейскае гарэлкі. Пасьлядоўнікі вялікага хіміка экспэрымэнтуюць з усім, што гарыць, ужываючы ці ня ўсю згаданую табліцу.

Многія, дабыўшы «да званка», застаюцца ў Сітне на ўсё астатняе жыцьцё: знаходзяць сужыцельку, уладкоўваюцца ў леспрамгас, падсаджваюцца на «максімку»... Так абмежаваньне волі ператвараецца ў пажыцьцёвы прысуд.

У Новай Беларусі ніякіх «хіміяў» ня будзе. Тыя, хто парушыў закон ненаўмысна, будуць плаціць вялікі заклад (а не даваць хабар «каму трэба»). Эканамічныя злачынцы будуць караццa, адпаведна, эканамічна. Забойцы ж, гвалтаўнікі й падлеткі-хуліганы будуць адбываць свой тэрмін не ў рассадніках крымінальнае сьвядомасьці й міліцэйскага садызму, а сам-насам з уласным сумленьнем і Біблiяй, пад гутаркі са сьвятаром.

Бо насамрэч ідэальныя дачыненьні чалавека й усяго грамадзтва выяўляе ня хімія й ня фізыка, а нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

У Новай Беларусі ніякіх «хіміяў» ня будзе.

## ХРОНІКА

**русі»**. Актывісту ПБНФ **Уладу Токараву** паведамілі пра адмову па тэлефоне.

**Іну Кулей** дапыталі ў крымінальнай справе ейнага сына **Ігара**: яго вінавацяць ва ўхіленьні ад войска.

**28 верасьня**

Аршанскія чыноўнікі не далі дазволу на мітынг з удзелам **А.Мілінкевіча**, спаслаўшыся, што на гарадзкім стадыёне пройдзе футбольны матч.

Суд над ксяндзом **Антоніем Кочкам**, прызначаны на гэты дзень, не адбыўся праз няяўку абодвух бакоў. Сьвятара вінавацілі ў парушэньні беларускага заканадаўства, бо адслужыў імшу ў Чырвоным касьцёле ў Менску, хоць сам ён служыць на Случчыне.

У Гомелі супрацоўнікі КДБ дапытвалі моладзевых актывістаў **Сяргея Палуяна** і **Вольгу Буранкову**.

Уступіў у сілу прысуд **Мікалаю Аўтуховічу** і **Юр’ю Лявонаву** — 3 гады і 6 месяцаў ды 3 гады і 5 месяцаў адпаведна.

Палітвязьня **Цімоха Дранчука** перавялі ў менскую калёнію №1. **Мікалая Астрэйку** перавялі ў Шклоўскую калёнію.

Выканкам Сьветлагорскага раёну Гомельшчыны паведаміў, што з журналу ўліку арганізацыйных структураў грамадзкіх аб’яднаньняў зьнятая мясцовая філія **ГА «ТБМ»**. Сябры суполкі даведаліся пра гэта з абвесткі ў мясцовай газэце.

**30 верасьня**

У Воршы былі затрыманыя моладзевыя актывісты **Сяржук Гумінскі**, **Віктар Кузьняцоў**, а таксама **Аляксей**, **Алесь** і **Андрусь** за тое, што мелі на вопратцы значкі «За свабоду!» і «16». У пастарунку іх абвінавацілі ў тым, што хлопцы ляпілі налепкі; ім пагражалі адказнасьцю за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі, але адпусьцілі праз 3 гадзіны, не складаючы пратаколаў.

**АШ**



# Атакі на вятрак

Цяпер форум за незалежнасьць можа ладзіць і БРСМ.
Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Тыя апанэнты рэжыму, што ўзброіліся пасьля выбараў тэзай пра хуткі аб'яднальны рэфэрэндум, зноў атакавалі вятрак. На прэсавай канфэрэнцыі для расейскіх журналістаў Лукашэнка пераканаўча давёў, што не зьбіраецца аддаваць Крамлю ні каліва ўлады. Во неспадзяванка!

Павісае ў паветры вылучаная Партыяй БНФ ідэя форуму і блёку «За незалежнасьць». Пасьля чарговага сэансу дзяржаўніцкай рыторыкі такі форум сьмела можа ладзіць і БРСМ.

Выглядае на тое, што колькі часу таму прыўладныя паліттэхнолягі спрытна падкінулі праціўнікам — у краіне і на Захадзе — тэму інкарпарацыі. У той сьвісток і сышла апазыцыйная пара. Хоцькі-няхоцькі згулялі паводле ўладнага сцэнару. У ролі пудзіла. На той прэсавай канфэрэнцыі прагучала, што ў выпадку паглынаньня тут будзе горай, чым як у Чачэніі. Бо апазыцыянэры *«сьпяць ды бачаць сябе ў нацыянальна-вызвольнай вайне героямі»*. Лідэры апазыцыі, якіх дзяўбуць за нерашучасьць, могуць цешыцца хіба тым, што мэтафарычна пастаўленыя на адну дошку з апантанымі муджагедамі.

Увогуле ж (як і прагназавала нашая «Палітычная кухня» паўгоду таму) Крамлю вылучаны сустрэчны пазоў: вайсковыя аб'екты, транзыт, мяжа ды мытня... Разам з патэнцыйнай супрацьтанкавай абаронай набягае на два мільярды. Паловай Менск лёгка разьлічыцца за падаражэлы газ. А Расея толькі *«абняслявіцца»*.

Усе гэтыя крыўдныя для Крамля рэчы Лукашэнка падвёў пад катэгорыю *«голай праўды»*. Можна сказаць і мацней.

Чаму ж Менск пачуваецца так упэўнена? Ды таму, у прыватнасьці, што праз газавы канфлікт зь ім Пуціну надта ж недарэчы нэрвуваць Эўропу. Магчыма, гаспадар Крамля вырашыць для сябе праблему-2008 акурат праз ачольваньне нейкай энэргетычнай супэркарпарацыі, гэткага «Газпрому» ў квадраце. І пры такім пляне — псаваць імідж надзейнага дастаўніка энэргарэсурсаў? Прасьцей зноў адкупіцца ад сварлівага партнэра. Дый пагроза страціць апошняга хаўрусьніка б'е ніжэй за пояс. Асабліва недарэчы *«поўны разрыў»* (а так жа і прагучала!) напярэдадні новых электаральных кампаній у самой Расеі. Народ не зразумее, навошта пакрыўдзілі братоў-беларусаў.

Чаму прымітыўны пяраўскі млын спраўна працуе столькі гадоў?

Найперш таму, што не мяняецца імпэрская сутнасьць расейскай дзяржавы. Тыя ж комплексы і фобіі. Гэта Крэмль зашчаміў лапу ў інтэграцыйную пастку. Ды такая нявыкрутка, што церпіць, нават калі зь Менску даюць па пысе ня горай, чым з Тбілісі.

Натуральна, і беларускі кіраўнік рызыкуе. А што застаецца? Іншая рэч, што ягоныя праціўнікі — як звонку, так і ў краіне — зь дзівоснай упартасьцю наступаюць на граблі. Дэмакратычная кааліцыя дайшла да поўнага каляпсу, што дэ-факта прызнаў Мілінкевіч, узяўшыся фармаваць аўтаномны рух «За свабоду!». Удалых пэрсаналісцкіх рухаў у найноўшай гісторыі Беларусі яшчэ не было.



**На фота: старшыня Цэнтравыбаркаму Лідзія Ярмошына прадстаўляе палаце прадстаўнікоў зьмены ў Выбарчы кодэкс. Згодна зь імі, мясцовыя выбары будуць праходзіць у адзін тур, а магчымасьці для кантакту апазыцыі з выбарцамі абмяжоўваюцца да нічога.**

# Оба-на, інтэграцыя!



500 «Сьнікерсаў» — вось кошт гэтай трубы!
Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Падчас сустрэчы з Лукашэнкам вядомы гумарыст Ігар Угольнікаў папрасіў АГЛ надаць свайму праекту «Фіціль» статус агульнасаюзнай праграмы. Даўно трэба пашыраць інтэграцыю на гумарыстычна-забаўляльны блёк!

«Фіціль», у сюжэтах якога будуць уздымацца актуальныя тэмы беларуска-расейскай інтэграцыі, сапраўды будзе супэрпрышпільны. Дастаткова прадэманстраваць гэта на нейкіх ягоных старых сюжэтах, напрыклад, на роліку «Дзіцячы садок».

Сцэнар сюжэту ролiку «Дзіцячы садок», падкарэктаваны з улікам таго, што праграма «Фіціль» стала агульнасаюзнай:

Музыка-застаўка праграмы.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Тытры: «Дзіцячы садок».

*У кадры рэпартэр, побач супрацоўніца садочку. На заднім пляне гуляюць дзеці.*

**Рэпартэр:** Маргарыта Сьцяпанаўна, распавядзеце нам аб дзетках, якія ў вас ёсьць?

**Супрацоўніца:** Ну, што можна сказаць? Дзеці падобныя да сваіх бацькоў, і гэта ісьціна відавочная. Глядзеце толькі, у што яны гуляюць. Вось, напрыклад, Гальляш. Ягоны татка працуе бізнэсоўцам.

*У кадры маленькі хлопчык на цацачным аўтамабілі, які размаўляе па цацачнай мабілцы.*

**Супрацоўніца:** А цяпер да яго ідзе Алежык. Ягоны тата — кіраўнік гарадзкога аддзелу ДАІ.

*У кадры да хлопчыка Гальляша падыходзіць Алег і патрабуе ад таго дакумэнты.*

**Супрацоўніца:** А Пецеў бацька — вялікая шышка ў «Газпроме».

*У кадры хлопчык у пясочніцы, рые, нібыта здабывае газ.*

**Супрацоўніца:** А там у нас Таня. Яна дачка звычайнай беларускай даяркі, якая зарабляе 600 баксаў. Ім у сям'і зусім няма куды дзяваць грошы.

*У кадры сядзіць Таня і тупа раскідвае фанцікі ад цукерак, якія сымбалізуюць даляры.*

**Рэпартэр:** Я гляджу, у вас у садку ёсьць нават дзеці іншаземцаў.

**Супрацоўніца:** Так, гэта Олаф, сын аднаго дацкага бізнэсоўца.

*У кадры хлопчык Олаф, ён ходзіць вакол клюмбы і кажа: «О-о-о! Мы ехалі сюды з асьцярогаю, можа быць, нават з жахам — дыктатура, сярэднявечча, крымінал... А цяпер мы вельмі падобраму зьдзіўленыя і жадаем будаваць каля гэтай клюмбы вялікі сьвінячы комплекс. Хто хоча інвэстыцыяў?»*

**Рэпартэр:** Мне казалі, што ў вас ёсьць сын аднаго крамлёўскага бонзы?

**Супрацоўніца:** Генік, ну, канечне. Вось ён.

*У кадры хлопчык Генік, які праглядае нейкія паперкі, потым ірве іх, адначасова кажучы: «Не, не. Мы надаем саюзнай дзяржаве занадта шмат паўнамоцтваў. Саюзную дамову трэба адкласьці. Нашая эліта не гатовая на такі шчыльны саюз».*

**Рэпартэр:** А ў тэй дзяўчынкі зь лялькамі, відаць, бацькі — пэдагогі?

**Выхавацелька:** Што вы. Ейныя бацькі — чачэнцы, якія зьбеглі з Расеі ў Беларусь і на знак падзякі лідэру краіны называюць сваіх дзяцей яго імем.

*У кадры дзяўчынка зь некалькімі цацкамі. Гуляе, гаворачы: «Саша хоча есьці. А гэты Саша хоча гуляць. А гэты Саша — спаць. Баю-бай. А ты, Саша, відаць, захварэў. Сапліва ты мой, амаль як малады прэзыдэнт».*

**Рэпартэр:** А хто бацька ў таго, вось у таго хлопчыка?

**Выхавацелька:** Я сама пакуль не зразумела, дзе працуюць бацькі Андрэя.

*У кадры маленькі хлопчык бегае з трубой і енчыць: «Я ні магу аддаць трубы за батончык «Сьнікерсу» і дзьве налепкі. Толька пусьці казла ў гарод! 500 «Сьнікерсаў» — вось кошт гэтай трубы!»*

Смех за кадрам.

*Раптам да яго падбягае Пеця і Генік і пачынаюць вырываць трубу.*

Смех за кадрам.

Музыка-застаўка праграмы.

Тытры: «Фіціль — агульнасаюзная праграма».

Дырэктар Ігар Угольнікаў.



## Я пазнала таго хлопчыка з Плошчы

**У «НН» №35 я прачытала «Тры гісторыі пра Сакавік» Марыі К. і пазнала ў другой гісторыі (пра маладафронтаўца) сваю гісторыю, сваё самае моцнае ўражаньне.** Узгадала, як пабеглі фатографы да хлапца, калі той прапанаваў гарбату першаму даішніку, які адразу адмовіўся. Калі гледачы адышлі, маладафронтавец накіраваўся да другога даішніка, які стаяў за некалькі мэтраў ад першага. Мне было вельмі балюча глядзець на гэта... Было заўважна, як халодна і аднаму, і другому, як зіхацелі вочы хлопчыка ад дабрыні і шчырасьці... **Даішнік доўга глядзеў на гарбату (на фота)**, на маладафронтаўца, на мой фотаапарат і... адмовіўся!

**Наста К., Менск**

## Відэа і аўдыё з Васілём Быкавым

**Ці ёсьць у сьвеце якоесь відэа альбо аўдыё з удзелам Васіля Быкава альбо пра яго і дзе яго можна набыць?** Спадзяюся на вашу дапамогу. Дзякуй.

**jtl, tut.by**

Ёсьць некалькі дакумэнтальных фільмаў, прысьвечаных Васілю Быкаву. Адзін зь іх — 10-хвілінны відэафільм «Васіль Быкаў. Франтавыя старонкі» — зьняў карэспандэнт АТН Міхась Равуцкі. Стужкі незалежных кінэматаграфістаў «Доўгая дарога дадому. Рэквіем» ды «Васіль Быкаў. Вяртаньне» забароненыя ў афіцыйным пракаце. У «Рэквіеме» гучаць маналёгі Р.Барадуліна, Г.Бураўкіна, В.Тараса, а ў «Вяртаньні», створаным да 80-годзьдзя пісьменьніка, відэа суправаджаецца закадравым маналёгам-развагай Васіля Быкава пра свабоду, незалежнасьць, мову і нацыю.

Набыць фільм «Васіль Быкаў. Вяртаньне» на DVD можна праз сайт www.knihi.com альбо, зьвярнуўшыся на адрас viartannie@tut.by. Таксама дыск можна пабачыць на выставах у сядзібе ТБМ (Румянцава, 13) ды БНФ (былая Варвашэні, 8). Таксама на выставе ТБМ ёсьць запіс тэленавінаў, прысьвечаных пахаваньню Быкава.

## Перавыданьне «Лірыкі змаганьня»

**У 1998-м выйшаў у сьвет альбом «Беларускія песьні і маршы. Лірыка змаганьня» мужчынскага хору «Унія».** Адкажыце, калі ласка, ці не плянуецца, часам, перавыданьне гэтага дыска. Калі не — падкажэце, дзе можна набыць тое выданьне васьмігадовай даўніны. У мяне ёсьць аўдыёкасэта з запісам «Лірыкі змаганьня», але гэта неаднаразовая «копія з копіі», і якасьць гучаньня, мякка кажучы, нездавальняльная. Я пляную апублікаваць у Сеціве «Паўстанцкую песьню 1863 г.» (спадзяюся, у вас пярэчаньняў ня будзе), а ўсе мае спробы прывесьці згаданы аўдыёкасэтны запіс у прыдатны стан аказаліся марныя. Дарэчы, буду ўдзячны за любыя матэрыялы на гэтую тэму.

**Зьміцер Кузьменка,**
адміністратар web-рэсурсу «Сьвіслацкія аркушы — Кастусь Каліноўскі»: arkushy.narod.ru/kalinouski; arkushy@narod.ru

Як паведаміў мастацкі кіраўнік хору «Унія» Кірыла Насаеў, плыткі «Беларускія песьні і маршы. Лірыка змаганьня» ў продажы няма, але да наступнага лета зьявіцца перавыданьне. «Паўстанцкую песьню» сп.Насаеў знайшоў у архіве Міколы Шчаглова-Куліковіча. Кіраўнік «Уніі» кажа, што гэта была простая гарманізацыя песьні. Зьвестак пра яе паходжаньне ў архіве не было.

## У Докшыцах зьявіўся помнік Леніну

**Докшыцы з кожным годам прыгажэюць.** У цэнтры гораду цешаць вока клюмбы з кветкамі, новая плошча з фантанам пры вуліцы Ленінскай. Гэта добра, але атмасфэра тут па-ранейшаму савецкая. Час невядомым чынам нясе нас назад у застойнае мінулае, даючы зразумець, што мы жывём не ў эўрапейскай, а ў савецкай рэспубліцы з усімі ейнымі атрыбутамі. Праз дарогу ад новай плошчы, якая мае эўрапейскі выгляд, стаіць тыповы савецкі будынак райвыканкаму. На ім красуецца барэльеф зь сярпом і молатам, нібы нагадваючы гараджанам, што СССР — не мінулае, а рэальнасьць. На пацьвярджэньне гэтага — чырвоны сьцяг над адноўленай дошкай гонару.

У верасьні ў гарадзкім парку пры вуліцы Гайдара зноў зьявіўся помнік Леніну. (Нагадаем, што ён быў дэмантаваны пры канцы 2005 г. падчас падрыхтоўкі да прыезду Лукашэнкі.) «Правадыр» стаіць, паклаўшы рукі ў кішэні, і кудысьці маўкліва пазірае. Паставілі яго акурат ля танцавальнай залі.

На шапіках «Белсаюздруку» і сёньня вісяць шыльды «Саюздрук» з тым жа самым сярпом ды молатам. Дзяржак чырвона-зялёнага сьцягу, што вісіць на будынку раённага суду, заканчваецца ромбікам ня з зоркай, як прадугледжвае Закон аб дзяржаўнай сымболіцы, а зь сярпом і молатам. Які сьцяг — такі і суд?

Улада адрадзіла камандна-адміністрацыйную эканоміку, БРСМ, ідэалягічную работу. На дзьвярох ідэалягічнага аддзелу райвыканкаму вісіць таблічка «ідыялягічны аддзел». Можа, тыя, хто пісаў, думалі, што слова «ідэалёгія» паходзіць ад слова «ідыёт»?

Як і ў савецкі час, людзі баяцца. «Ня трэба нічога рабіць, усё адно толькі праблем на ўласную галаву нажывеш», — кажуць людзі. Нават пра свае звычайныя праблемы — дрэнныя дарогі, дрэннае ацяпленьне — людзі маўчаць, бо баяцца наклікаць гнеў сыстэмы. У афіцыйныя вынікі выбараў у Докшыцах ня верыць, мабыць, ніхто, але дакшычанаў на Плошчы ў Менску не было.

Народ у страху. Людзі баяцца сказаць праўду. Людзі не адстойваюць свае правы, бо баяцца пазбавіцца працы. Пра адраджэньне мовы, культуры ды гісторыі не вядзецца й гаворкі. Але ж траціць надзею ня варта, бо дыктатура ня вечная.

**Янка Зуброўскі з Лапутаў**

## Віншую Гілевіча

**Далучаю свой голас да тысячаў віншаваньняў на адрас дарагога ўсім беларусам юбіляра — шаноўнага Ніла Гілевіча.** Люблю яго, як свайго роднага дзядзьку, старэйшага сябра, аднадумца і дарадчыка. У ягоных творах чытаю маю шчырую, збалелую Беларусь. А тыя творцы і члены «правільнага» ваенна-паэтычнага саюзу, што імкнуцца замоўчваць вялікага Паэта, сапхнуць яго з высокага п'едэстала, дарэмна стараюцца. Ніл Гілевіч — назаўжды народны.

А пра іх — што скажаш? Хіба такое:

Генэральны пісака
Надзейна, нібы манумэнт, засеў,
Валадарам гнаў оды, аж зьлсеў.
А колькі перавёў чарніла!
Ды ўсё ж папера нат ня сніла,
Каб з-пад ягонага пяра —
З усіх тамоў, што выйшлі на-гара, —
Наскробся хоць радочак, годны Ніла.

**Антон Бубала, Верхнядзьвінск**

## Дзякуй Дашкевічу

**Год таму, нам, хлапцам па 14—15 гадоў, пашанцавала сустрэць Зьмітра Дашкевіча.** Цяпер, калі ён за кратамі, я задумваюся, што Зьміцер зрабіў для нас?

Кім былі б мы, каб не сустрэлі тады Дашкевіча? Пэўна, пілі б піва, былі б усім задаволеныя... Дзякуючы яму, мы зьмяніліся. Мы сталі Беларусамі! Так, шмат выпрабаваньняў пройдзена, шмат людзей ня вытрымала. Але цяпер я магу з пэўнасьцю сказаць: на тры дзясяткі Беларусаў стала болей. Менавіта Зьміцер падтрымліваў нас у цяжэйшыя моманты. Кім былі мы дагэтуль? Пасіўная маса, з усім, што з гэтага вынікае. Як мы зьмяніліся? Хлопцы кідалі паліць, пачыналі размаўляць на роднай мове, вывучаць гісторыю сваёй краіны. Зьміцер быў для нас узорам.

Арышт Дашкевіча дае адваротны эфэкт. Ён натхняе нас на далейшае змаганьне.

**Іван Шыла, Салігорск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# Як кітайскі абутак ураtaваў Беларусь ад санкцыяў,

або Палітычны гандаль унутры Эўрасаюзу.



WWW.CCBE.ORG

Ёсьць пагроза, што кітайскі абутак пераб’е намеры Эўразьвязу (ЭЗ) накласьці гандлёвыя санкцыі на Беларусь. Паводле інфармацыі чыноўнікаў ЭЗ, Італія, у адпаведнасьці з клясычнымі правіламі палітычнага гандлю ўнутры ЭЗ, выкарыстоўвае пытаньне Беларусі, каб дамагчыся свайго ў аніяк не зьвязанай з нашай краінай спрэчцы пра антыдэмпінгавыя мыты.

26 верасьня афіцыйны Рым ашаламіў Брусэль, калі ўстрымаўся ад галасаваньня за ўвядзеньне санкцыяў супраць Беларусі. Сваім рашэньнем Італія дазволіла Польшчы, Літве і Латвіі заблякаваць прапанову выключыць Менск з Агульнае сыстэмы прэфэрэнцыяў (GSP) у гандлі.

Але калі згаданая тройка краінаў працівілася рашэньню з прычыны перасьцярог, што гэта можа нэгатыўна адбіцца на гандлі, прадстаўнікі ЭЗ сьцьвярджаюць, што матывам Італіі было адпомсьціць Вялікабрытаніі, Нямеччыне і Швэцыі за тое, што яны заблякавалі прапанову ЭЗ увесьці мыты на танны кітайскі абутак, які пагражае існаваньню італьянскіх вытворцаў абутку.

Як кажа адзін эўрапейскі дыплямат, «існуе джэнтэльмэнскае пагадненьне, што дзяржавы-сябры ЭЗ будуць абараняць сваіх вытворцаў. Паўночныя краіны, якія імпартуюць абутак, парушылі гэтае пагадненьне, і цяпер краіны ЭЗ, што вырабляюць абутак, вядуць атаку на іхнюю палітыку ў іншых сфэрах».

Пытаньне скасаваньня сыстэмы агульных прэфэрэнцыяў у гандлі для Беларусі яшчэ раз разглядацьмуць 12 кастрычніка, але да гэтага амбасадары ЭЗ сустракающца 3 і 4 кастрычніка, каб паспрабаваць прыйсьці да пагадненьня аб так званых кітайскіх «антыдэмпінгавых» мытах.

Афіцыйны прадстаўнік Эўракамісіі заявіў, што «палітычныя наступствы будуць вялікія», калі Італія будзе надалей прытрымліваццa такой лініі ў беларускім пытаньні падчас галасаваньня 12 кастрычніка, бо выключэньне з GSP грунтуецца на 18-месячным расьсьледаваньні парушэньняў афіцыйным Менскам міжнародных пагадненьняў аб правох прафсаюзаў.

«Пазыцыя Італіі цалкам непрымальная, — паведаміла крыніца з Эўракамісіі. — У тым сэнсе, што Эўразьвяз мусіць прызнаць, што беларускі рэжым практыкуе грубыя парушэньні».

Са свайго боку, Італія рашуча адмаўляе любую сувязь паміж кітайскім і беларускім дасье і сьцьвярджае, што, устрымліваючыся падчас галасаваньня, яна хоча пакінуць Менску апошні шанец, каб пачаць гуляць паводле правілаў «бізуна і перніка».

Італьянскі прадстаўнік зазначыў: «Ці можна сабе ўявіць, каб левацэнтрысцкі ўрад Рамана Продзі штосьці рабіў бы ў піку меркаваньню міжнароднага прафсаюзнага руху?»

## Сакрэт брусэльскага палішынэля

Той факт, што краіны — сябры ЭЗ гандлююцца, саступаючы ў адной справе наўзамен за пазытыўнае рашэньне іншае, аніяк не зьвязанае справы, — агульнавядомы сакрэт палітычнага працэсу ў Эўрапейскім Зьвязе.

Пры канцы 2005 г. Брусэль бурліў чуткамі, што Францыя дала сваю згоду на прызнаньне за Македоніяй статусу краіны — кандыдаткі на ўступленьне і на пачатак перамоваў з Турцыяй аб далучэньні ўзамен на згоду Вялікабрытаніі з плянамі рэформы бюджэту ЭЗ.

У 1992 г. Вялікабрытанія пагадзілася дазволіць Францыі ўпісаць у Дамову аб Эўрапейскім Зьвязе палажэньне пра Страсбург як сядзібу Эўрапейскага парлямэнту наўзамен згоды Парыжу на магчымасьць для Лёндану не прымяняць сацыяльнага заканадаўства ЭЗ.

«Калі ты даеш мне згоду на гэта, я пазьней пагаджуся з табою ў тым — вось так працуе Эўропа», — падсумаваў эўрапейскі дыплямат, папярэджваючы, што пазыцыя Італіі ў беларускім пытаньні можа быць толькі пачаткам падпольнае абутковае вайны.

**http://euobserver.com/9/22536**

**Пераклаў Алесь Лагвінец**

По больш дэталёвую інфармацыю пра жыццё Эўропы зьвяртайцеся да ўэб-бачынаў http://www.belarus-europe.info/ і www.belarus-europe.info.

Тэлепраграма «Акно ў Эўропу» трансьлюецца на канале RTV і праз кабэльнае тэлебачаньне штонядзелю а 17-й з паўторам у панядзелак (а 5.00), аўторак (12.00), чацьвер (5.00) і суботу (2.00).

Штотыднёвая радыёпраграма «Акно ў Эўропу» трансьлюецца на Эўрапейскім радыё для Беларусі на частотах AM і FM, праз спадарожнік і ў Сеціве а 8-й раніцы (AM: 612 kHz, спадарожнік: 11013 Mhz, Сеціва: http://www.belradio.fm/, www.belradio.fm/, FM: 103.4 а 5.40).

Гэтыя праграмы фінансуюцца Эўракамісіяй.

# У Воршы адновяць адзіны ў Беларусі пячорны храм

Рэшткі пячорнага храму былі адкрытыя на пачатку XX ст. пад падмуркам Богаяўленскага сабору. Знайшлі іх манахі куцеінскага Богаяўленскага манастыра. Маленечкая, каля 11 м$^2$, пячорная падземная царква Сьвятога Лазара ня мае аналягаў у Беларусі, затое ў драбніцах падобная да храмаў, знойдзеных археолягамі ў Чарнігаве.

Куцеінская лаўра — помнік гісторыі і архітэктуры XVII стагодзьдзя. НАН Беларусі пастанавіла, што манастыр трэба цалкам аднавіць. За працу ў яго адраджэньні возьмуцца ў 2007—2010 г. У тым ліку будзе адноўленая і ўнікальная пячорная царква.

**Народныя навіны Віцебску**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Нясьвіскі палац рэстаўруюць шляхам дэмантажу

27 верасьня рада Міністэрства культуры прыняла рашэньне пра дэмантаж усходняй галерэі Нясьвіскага замку.

Галоўны архітэктар інстытуту «Менскграмадзянпраект» Пятро Саўчук тлумачыць, што падмуркі, сьцены, скляпеньні знаходзяцца ў аварыйным стане, бо страцілі апорныя ўласьцівасьці. Пакрытая расколінамі галерэя, якую маюць разьбіраць, яшчэ стаіць, падпертая драўлянымі слупамі. Пасьля дэмантажу старой канструкцыі галерэю адбудуюць наноў. Абяцаюць, што форма і профіль пабудовы будуць захаваныя.

**СХ**

## Росьпісы ў Глыбокім змывалі брандспойтам

Пад старой тынкоўкай у саборы Раства Прасьвятой Багародзіцы ў Глыбокім знойдзеныя старажытныя росьпісы — выявы мальтыйскіх крыжоў ды герба Ордэну кармэлітаў. Унікальную знаходку спрабавалі зафарбаваць цішком ад каталікоў і Міністэрства культуры.

Росьпісы могуць датавацца XVII ст., калі ў Магілёве, Мядзеле, Вільні, Горадні паўсталі кляштары кармэлітаў, а ў Глыбокім за грошы ваяводы Язэпа Корсака для іх узьвялі мураваны касьцёл Усьпеньня Маці Божай. У гісторыю ён увайшоў як першы ўзор віленскага барока ў Беларусі. «У касьцёле быў вялікі арган. Меліся вялікія хоры. Кармэліты ўтрымлівалі 40 музыкаў», — пісаў дасьледчык беларускай даўніны Сапуноў.

— Мы тынкоўку змывалі і намёку не заўважылі, што храм быў расьпісаны цалкам. Калі б там лікі сьвятых былі! А гэтыя сымбалі маюць каштоўнасьць толькі для каталікоў, — кажа настаяцель храму айцец Сяргей.

Відавочцы сьцьвярджаюць, што тынкоўку зь сьценаў храму змывалі брандспойтам.

— Хутчэй за ўсё, мы іх проста зафарбуем. Калі хто захоча пабачыць і дасьледаваць, дык у нас засталіся здымкі, — дзеліцца плянамі айцец Сяргей. — Гэта ня помнік, а храм. Ня носіць жа чалавек каталіцкі крыж пасьля таго, як перахрысьціўся ў праваслаўе.

«Зафарбаваць фрэскі, пакуль няма грошай для дасьледаваньняў, — ня самая благая ідэя. Галоўнае, каб фарба была адпаведнага складу і канчаткова не загубіла фрэсак, а закансэрвавала іх», — мяркуе Ігар Чарняўскі, намесьнік кіраўніка дэпартамэнту па захаваньні гісторыка-культурнай спадчыны Мінкульту.

Але ў глыбоцкім саборы сьпяшаюцца закончыць рамонт цішком, лічачы, што выкананьне фармальнасьцяў нясе гібель храму, які ўнесены ў Дзяржаўны сьпіс помнікаў архітэктуры рэспубліканскага значэньня.

**Паводле сайту gazetaby.com**




## І шыльда не ўратавала

Зьнішчаны дом на рагу Гандлёвай і Герцэна.

Разбурэньне старога гораду ў Менску працягваецца. Вось ужо зьнішчылі дазваньня й дом №12 на рагу вуліцаў Герцэна й Гандлёвай. Той самы, дзе некалі красавалася мармуровая шыльда, надпіс на якой сьведчыў, што тут знаходзіцца Верхні горад, што ён «ахоўваецца дзяржавою» і г.д. Уважалася, што гэты дом — помнік грамадзянскага дойлідзтва канца XVIII — пач. XIX ст.

Горад, які паўстае на месцы старых мураванак, усё болей нагадвае танную кантрафактную падробку.

**СХ**

# Сымон-музыка выйдзе ў джынсах

Фольк-тэатар «Госьціца» і гурт *Grig Percussion* падрыхтавалі спэктакль-экспэрымэнт «S-музыка».




На сцэне Дзяржфілармоніі будуць біць у бубны і бляшанкі з-пад кансэрваў, а Коласаў Сымон-музыка апранецца па-сучаснаму, пойдзе ў начны клюб ды зайграе… на трубе. Прэм’ера музычна-пластычнага спэктаклю «S-музыка» мае быць 6 кастрычніка. Кіраўнічка «Госьціцы» Ларыса Сімаковіч: «Магчыма, гэта будзе адзіны паказ. У мяне часта бывае, што прэм’ерай усё сканчаецца».

Л.Сімаковіч і лідэр гурту *Grig Percussion* Ігар Аўдзееў даўно задумалі зрабіць незвычайны спэктакль па матывах паэмы Якуба Коласа. Каб там было сола трубы, каб грымелі ўдарныя інструмэнты, каб сьпявалі аўтэнтычныя галасы. «На жаль, прэм’ера многа разоў адкладалася, бо ня надта кіраўніцтва філармоніі вітае экспэрымэнты». *Grig-Percussion*, як часта бывае з прафэсійным айчынным калектывам, больш вядомыя за мяжой. Хоць існуе аж з 1986 г. і ў ім перайгралі амаль усе славутыя беларускія бубначы. Гурт пастаянна бярэ ўдзел у міжнародных фэстах, а апошні дыск запісаў летась у Парыжы на *Radio France*. Назву, пад якой яны граюць з 2005 г., абралі ня ў гонар нарвэскага кампазытара, а ў знак пашаны да спонсара Віктара Грыгор’ева, які робіць палачкі для ўдарных інструмэнтаў. У спэктаклі «S-музыка» гурт возьме на сябе ня толькі акампанэмэнт. «Мы таксама будзем рухацца, бо пастаноўка — суцэльная дзея, а таксама выканаем ролю грэцкага хору», — кажа Віктар Аўдзееў. Музыка характарызуе спэктакль як сынтэз музыкі для ўдарных і аўтэнтычных галасоў з салістам трубачом. «Сымонам-трубачом» будзе таленавіты малады музыка Сяргей Петрашкевіч. Труба, 30 ударных інструмэнтаў і сьпевы «Госьціцы»: «І гэта яшчэ ня ўсё, — кажа аўтар музыкі да спэктаклю Л.Сімаковіч. — У першым аддзяленьні музыкі выканаюць *Happening* аўтарства Джона Кейджа. Будзе фэерыя гуку: музыкі будуць дзьмухаць у бутэлькі, біць у бляшанкі і па скрынях…»

Спадарыня Ларыса прапануе свой погляд на паэму Якуба Коласа: «Вельмі актуальны твор, і кожны бярэ ад яго нешта сваё. Мая канцэпцыя такая: геній абірае гэты народ, гэтую зямлю, каб вярнуць людзям голас і пазбавіць ад здранцьвеньня. Таму я перарабляю коласаўскага скрыпача ў трубача з мацнейшым голасам і пасылам, каб яго сапраўды пачулі. Такі моцны інструмэнт, як труба, атачаны моцнымі бубнамі, тамтамамі, іншымі ўдарнымі інструмэнтамі. І ўсё гэта выглядае па-сучаснаму! Галоўны герой выйдзе ў джынсах, яго нават у начным клюбе, паводле задумкі, будуць спакушаць!»

Ларыса Сімаковіч кажа, што адміністрацыя філармоніі яшчэ ня ведае да канца, што гэта будзе за спэктакль. І рэакцыю прадказаць не бярэцца: «Могуць і электрычнасьць вымкнуць, але, спадзяюся, да гэтага ня дойдзе. Мы пра гэта намагаемся ня думаць». Было такое, што спэктаклі «Госьціцы» паказваліся першы і апошні раз. Л.Сімаковіч не выключае такога варыянту і з «S-музыкам»: «Тут наўрад ці нам дадуць яе паўтарыць. Але ў нас ужо ёсьць замовы на паказ у іншых краінах».

**Прэм’ера спэктаклю «S-музыка» — 6 кастрычніка ў Вялікай залі Белдзяржфілярмоніі. Пачатак а 19:00. Кошт квіткоў: 4000—8000 руб.**

**Сяргей Будкін**

# Фабіян і Людвіка ў «Беларускай хатцы»

На сцэне — толькі пачуцьці.

У чацьвер 28 верасьня ў «Беларускай хатцы» (вул. Рабкораўская, 19) адбылася прэм’ерная пастаноўка гістарычнай драмы Людмілы Рублеўскай і Віталя Скалабана «Людвіка і Фабіян». П’еса была напісаная з ініцыятывы Віталя Скалабана, які ў дзяржаўных архівах знайшоў багата матэрыялаў пра жыцьцё Зоські Верас і Фабіяна Шантыра. Ён прапанаваў папрацаваць над гэтымі дакумэнтамі пісьменьніцы і журналістцы Людміле Рублеўскай. Так і ўзьнік гэты творчы тандэм.

Яшчэ ўвесну ў выдавецтве Віктара Хурсіка выйшла кніга «Людвіка і Фабіян», а пастаноўка адбылася толькі цяпер. Яна магла прайсьці і значна раней. П’есу рыхтаваў да пастаноўкі магілёўскі рэжысэр Валянцін Ермаловіч, родны брат славутага гісторыка Міколы Ермаловіча. Аднак спэктакль не адбыўся з прычыны сьмерці рэжысэра. Менскія тэатры не праявілі да драмы ніякага інтарэсу.

У «Беларускую хатку» на прэзэнтацыю прыйшло багата людзей, ня кожнаму прысутнаму хапіла месца на лавах. У тым, што прэм’ера адбываецца менавіта ў «Беларускай хатцы», бачыўся некаторы сымбалізм: Зоська Верас добра ведала і паважала амаль усіх тых асоб, чые партрэты зьмешчаныя на сьценах у гэтым будынку.

На пачатку імпрэзы гледачоў забаўлялі беларускімі песьнямі дзеці зь міханавіцкай фальклёрнай групы «Калыханка». Варта было бачыць, зь якім замілаваньнем глядзеў на гэты выступ вядомы публіцыст Аляксандар Фядута.



Фабіян Шантыр.

Потым пачаўся ўласна спэктакль. Зрэшты, называць дзею сапраўдным спэктаклем не выпадае: маладыя акторы ня гралі на сцэне, а проста чыталі дыялёгі герояў. Марына Дзямідчык і Сяргей Здаранкоў, студэнты пятага курсу Ўнівэрсытэту культуры, як маглі давалі рады, каб ужыцца ў ролі. Толькі часам адчувалася не зусім правільнае вымаўленьне беларускіх словаў — бяда ўсяго беларускага тэатру.

Дзеля прэзэнтацыі аўтары абралі эпізоды, зьвязаныя зь лініяй каханьня Зоські Верас і Фабіяна Шантыра, апускаючы грамадзка-палітычны, сацыяльны кантэкст.

Дырэктар Дзяржкамархіву Ўладзімер Адамушка жартаваў, што цяпер баіцца згубіць архівіста Скалабана, бо той можа лёгка сысьці ў літаратуру. Дарэчы, гэта ўжо другая п’еса, напісаная сп. Віталём. Першую, «У жніўні 1936-га», яшчэ ў 2002 г. паставіў Купалаўскі тэатар. Архівіст паўжартам сказаў, што ўжо даўно напісаная і трэцяя. Ведаючы працаздольнасьць Скалабана, у гэта ахвотна верыш.

Уладзімер Содаль параіў аўтару прапанаваць п’есу на радыё. Але ці наважацца радыйшчыкі на такі крок? Спадар Скалабан ужо зьвяртаўся да іх, але не атрымаў уцямнага адказу.



СА ЗБОРУ ВІТАЛЯ СКАЛАБАНА

Зоська Верас.

Літаратуразнаўца Арсень Ліс расказаў, што дома мае каля пяцісот лістоў ад Зоські Верас. Калі эпісталярная спадчына гэтай руплівіцы беларускасьці выйдзе асобнай кнігай, мы наноў адкрыем для сябе ўсе тыя глыбы і пласты беларускай культуры, зьнітаваныя імем Людвікі Сівіцкай-Войцік — Зоські Верас.

**Зьміцер Панкавец**

**Больш пра трагічную гісторыю каханьня Зоські Верас і Фабіяна Шантыра** можна пачытаць у «НН» №18 за 2005 г.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«Беларуская хатка» зь цяжкасьцю зьмясьціла ўсіх гледачоў.**







У свой час

# Эдвард Вайніловіч
# Магдалена Радзівіл
# Васіль Быкаў
# **ахвяравалі на «Нашу Ніву»**

з пачатку 2006 году
газэта атрымала
6700 ахвяраваньняў
з усіх куткоў Беларусі.
Дзякуй!



# Як нараджаецца газэта?

## Сябра, ты трымаеш у руках новы нумар «Нашай Нівы». А ці ведаеш ты, як зьяўляецца на сьвет газэта?




01

Спачатку **галоўны рэдактар** і ўсе **супрацоўнікі** вырашаюць, пра што чытачам будзе цікава прачытаць у наступным нумары. Кожны журналіст атрымлівае заданьне.

02

Потым **журналіст** шукае і запісвае навіну, а **фотакарэспандэнт** робіць здымкі.





03

Вярнуўшыся ў рэдакцыю, журналіст прыдумляе тэкст і набірае яго на кампутары. Гэта вельмі складаная праца, бо трэба, каб артыкул выйшаў цікавы і дакладны.



## 04

Пасьля таго як журналіст напісаў артыкул, **карэктарка** правярае, ці няма ў ім памылак (для гэтага часьцяком даводзіцца зазіраць у слоўнік, які карэктар заўжды мае пры сабе).




## 05

Між тым у рэдакцыі кіпіць праца. **Сакратарка** тэлефануе, а **дызайнэр** (ён файна разьбіраецца ў камputарных праграмах) прыдумляе, як трэба разьмясьціць артыкулы і фота на старонцы. Акрамя гэтага, ён ставіць газэту ў Інтэрнэт. Тым часам галоўны рэдактар дае яму карысныя парады.

## 06

Кампутарную газэту дасылаюць у **друкарню**. У друкарні газэту друкуюць на сапраўднай паперы — атрымліваецца цэлы стос, вельмі-вельмі цяжкі! Цяпер трэба аднесьці яго назад у рэдакцыю.




## 07

Вось так і нараджаецца новая **«Наша Ніва»**!

Капітан Танака ©

# Мядзьведзік у Бэрліне

На нямецкім вакзале атайбаваўся плястмасавы драпежнік—піянэр зь Беларусі.

Хто б мог падумаць, што, шпацыруючы па галоўным бэрлінскім вакзале, можна сутыкнуцца носам да носу зь беларускім мядзьведзем? Зрэшты, ня толькі зь ім: уздоўж вакзальных плятформаў сшыхталіся больш за 100 бяскрыўдных плястмасавых драпежнікаў, кожны зь якіх размаляваны мастаком адной з краінаў-удзельніцаў акцыі «Аб’яднаныя мядзьведзікі». Праводзіцца яна пад эгідай ЮНІСЭФ і ўжо назьбірала 1 180 000 эўра — падчас сусьветнага турнэ плястмасавых мядзьведзяў пакрысе прадаюць з аўкцыёну. Грошы пойдуць на дапамогу дзецям зь бедных сем’яў.

Большасьць мядзьведзікаў аздобленая «па-народнаму» ці ў адпаведнасьці з агульнавядомымі стэрэатыпамі пра тую ці іншую краіну. Беларускі мядзьведзь выбіваецца з гэтага шэрагу. Мастак Ігар Ермакоў расфарбаваў яго ў стылі, які можна назваць «крамбамбульным глямурам», навеяным выступамі дуэту «Сашы і Сірожы». Лёгкі кічавы абсурдызм, не пазбаўлены жыцьцярадаснасьці. Прычым — беларускамоўны. Мядзьведзік уяўляе сабою «шкадлівага піянэра», чыё цела — шчыльны летапіс бесклапотнага дзіцячага лета з хмаркамі, за якімі «нехта схаваўся», ды казюркамі, што поўзаюць па пясковым беразе.

Наступны прыпынак беларускага мядзьведзя разам зь сябрукамі — Вена, а налета — Буэнас-Айрэс.

**Алесь Кудрыцкі, Бэрлін**
**Фота аўтара**




**Беларускі мядзьведзік аб’едзе цэлы сьвет.**



Плястмасавыя мядзьведзі—ўдзельнікі акцыі ЮНІСЭФ «Аб’яднаныя мядзьведзікі» ўжо «назьбіралі» 1 180 000 эўра на дабрачынныя мэты.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Спэцэфэкты ўсё тыя ж

**Зьдзелка з д'яблам** (Covenant).

ЗША, 2006, каляровы, 97 хв.

**Жанр:** моладзевая містыка.

**Адзнака:** 5 (з 10).

Калісьці пяць вядзьмацкіх сем'яў заключылі пакт маўчаньня. Яны ня будуць дэманстраваць магічную сілу, што адбірае маладосьць і выклікае люты перасьлед. Нашчадкі чатырох сем'яў вучацца ў элітным каледжы і выкарыстоўваюць магію, каб заляцацца да дзяўчатак. Але ў каледжы зьяўляецца тайны злы маг, які забівае людзей і насылае прывідаў...

Карціна «Зьдзелка з д'яблам» спалучае моладзевыя «расьсякальнікі» і містыку. Ад герояў расьсякальнікаў патрабуецца пасіўнасьць, гучны віскат і небагатыя інтэлектам размовы. Ведзьмакі ж мусяць выяўляць маньячныя схільнасьці. Сцэнарыст фільму не знайшоў годнага вырашэньня дылемы, але рэжысэр і прадусэры хібы замазалі.

Рэжысэр Рэні Харлін — годны профі індустрыі кашмараў («Глыбокае сіняе мора», «Экзарцыст: пачатак»). Замест вобразаў — прадуманыя манкі: незамыленыя пекныя твары, палітнарэктная аголенасьць абодвух палоў, адразу дзьве гераіні ў небясьпецы.

Але галоўнае — спэцэфэкты. Ад сьцямнелых вачэй і сяброўскага шпурляньня сьметніцаў — да аўтамабіля, які разьбіраецца й зьбіраецца ў дарозе. Атмасфэрка змрочная, эфэктная бойка маланкавымі згусткамі, цэлы й прадметы спраўна лётаюць і прабіваюць муры.

Злыя языкі сьвярджаюць, што ўсё гэта ўжо было (у «Званку», «Людзях Х») — і гэта праўда. Але Рэні Харлін намякае на новую сэрыю — і мае на гэта поўнае права.




10 кастрычніка а 18-й у Музэі Багдановіча (Траецкае перадмесьце). Алесь Камоцкі і Алег Змушка прэзэнтуюць альбом «Дах».

## ТЭАТАР

**Купалаўскі тэатар**

**6 (пт)** – «Я не пакіну цябе».
**7 (сб)** – «КІМ».

**Тэатар лялек**

**6 (пт)** — «Гісторыя аднаго гораду».
**7 (сб)** — «Чырвоны каптурок».
**8 (ндз)** — «Вясёлы цырк».
**10 (аўт), 11 (ср)** — «Ганэле».
**12 (чц)** — «Дом, які збудаваў Суіфт».
**14 (сб)** — «Чароўная лямпа Аладына».
**15 (ндз)** — «Чараўнік Смарагдавага Гораду».

## ФЭСТ

**Пятніца. 13**

13 кастрычніка ў клюбе Step (Прытыцкага, 62, 100 м. ад ст.м. «Кунцаўшчына») — фольк/pagan fest «Пятніца. 13» з удзелам гуртоў: GUDA, ZNICH, ЛІТВІН ТРОЛЬ, SONCAVAROT, КАМАЕДЗІЦА. Пачатак а 18:00. Даведкі: 649-08-88, 766-24-25. Квіткі: 10 000. Продаж: пераход Я.Коласа.

## КІНО НА DVD

**ТРЫ МАГІЛЫ** (Three Burials of Melquiades Estrada).
Драма, ЗША—Францыя, 2005, рэж. **Томі Лі Джонз**. У ролях: **Томі Лі Джонз, Бэры Пэпэр.**
З закладнікам на ланцугу і целам, прывязаным да мула, герой адпраўляецца ў Мэксыку, каб аднавіць справядлівасьць... Прызы Канскага кінафэсту за найлепшую мужчынскую ролю і сцэнар.
**Менск, Кісялёва, 12. Т: 643-21-08**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 7 кастрычніка

**СТВ, 21.20**

«Глядыятар».

ЗША, 2000, рэж. Рыдлі Скот.

Пэплюм (касьцюмна-гістарычны фільм на антычную тэму).

Відовішчны касьцюмны фільм, які заслужыў дакор гісторыкаў, але захапленьне аўдыторыі.

«Оскар» за найлепшы фільм, найлепшы дызайн касьцюмаў, найлепшага актора (вядома ж, Расэл Кроў), найлепшы гук. Намінацыі — за рэжысуру, мантаж, апэратарскую працу, сцэнар і музыку.

**АНТ, 00.25**

«Забі мяне пяшчотна».

ЗША, 2001, рэж. Чэн Кайге.

Трымценьнік.

Сустрэча з Адамам зьмяніла жыцьцё Эліс. Толькі пасьля вясельля яна ўсьведамляе, што анічога ня ведае пра свайго палкага мужа... Стандартная гісторыя Сіняй Барады, пастаўленая кітайскім клясыкам Чэнам Кайге. Пекная карцінка, непрыхаваныя сэксуальныя сцэны — і шчасьлівы фінал.

Ролі выконваюць: Хэзэр Грэм («Аптэчны каўбой»), Джозэф Файнз («Закаханы Шэкспір»).

**БТ, 23.20**

«Зламаныя кветкі».

ЗША—Францыя, 2005, рэж. Джым Джармуш.

Мэлядрама.

Трагікамічна-нязграбны Біл Мурэй у ролі састарэлага кавалера, сувора-тактоўны Джым Джармуш, Шэран Стоўн і Тыльда Суінтан — у якасьці сябровак, і шчымлівы боль ад скамечанага жыцьця.

Гран-пры Канскага кінафэсту.

### Нядзеля, 8 кастрычніка

**БТ, 13.45**

«Час кіно».

Беларусь, 2006, рэж. Галіна Адамовіч, Сяргей Кацьер.

Гэты выпуск тэлеперадачы прысьвечаны беларускаму музыку Віктару Капыцьку, які ня толькі піша опэры, але й складае музыку да кінафільмаў.

**Лад, 18.00**

«Чырвонае сонца».

Францыя—Італія—Гішпанія, 1971, рэж. Тэрэнз Янг.

Вэстэрн ад экспэрта па «бандыяне» — Тэрэнза Янга.

У ролях: герой самурайскіх фільмаў Тасыра Міфунэ, Чарлз Бронсан, Ален Дэлён.

**НТВ, 00.55**

«Віва, Марыя!».

Францыя—Італія, 1965, рэж. Люі Маль.

Вэстэрнова-рэвалюцыйная камэдыя.

Патомная тэрарыстка (!) Марыя разам зь сяброўкай-актрысай Марыяй (!) складае падрыўны сцэнічны дуэт і змагаецца за свабоду Мэксыкі...

У галоўных ролях дзьве бомбы: Брыджыт Бардо і Жанна Маро.

Карціна — гнюсны паклёп на беларускую рэчаіснасьць і кіраўніцтва да дзеяньня шматлікім флэшмобэрам.

**Андрэй Расінскі**



**Па гарызанталі :** **1.** Дэлікатэсная расьліна, лекавы сродак (гл. НН. 2006. №18). **4.** Польскі горад зь Беларускім культурна-асьветніцкім цэнтрам. **6.** Вершаваная стапа з націскам на апошнім складзе. **9.** Менскі палітоляг, аўтар «НН» і «ARCHE». **11.** Вёска на Сьветлагоршчыне, дзе карэспандэнт «НН» выдае газэту. **12.** Нобэлеўскі ляўрэат, у 2005 г. друкаваўся ў «НН». **13.** Гаспадарчая частка першай «НН». **15.** Гэтай прафэсіяй давялося авалодаць П.Севярынцу ў высылцы. **16.** Яго абвяшчаюць і выйграюць. **17.** У канцы 1900-х ён з Кіева вёў аддзел у «НН»; пайшоў з жыцьця маладым. **19.** Імя фэльчаркі, аўтаркі «Першага чытаньня для дзетак беларусаў» (1906). **22.** Ёсьць у кожнай добрай газэты. **24.** Імя беларускай рок-сьпявачкі. **29.** Полацкі карэспандэнт «НН». **30.** Гарадзенскі «юрлівы» паэт, аўтар «НН» і «ARCHE». **31.** Газэта-спадарожніца «НН». **32.** Крочыць поруч з Сабакам. **35.** Купалаўскі, Коласаўскі, Свабодны… **37.** Менскі бард, мае альбом «Дах». **38.** Французкі сацыёляг XX ст., знаўца арганізацыйнае культуры. **40.** Нялюбы аўтар «НН». **41.** Тое, што і дзяржава. **43.** Капітан, аўтар «Газэткі дзеткам». **47.** Ёю мыюць падлогу ў рэдакцыі. **48.** Сталы аўтар «НН», цікуе за кіно і тэлевізіяй. **52.** Агракамбінат у Нясьвіскім раёне, флягман беларускай гаспадаркі. **55.** Так звалася Ліепая ў часы першай «НН». **56.** Украінскі музыка з гаваркім прозьвішчам. **57.** Яе паказаў чытачам «НН» і слухачам радыё «Свабода» Рыгор Барадулін у 2004 г. **59.** Імя паэта, хроснага бацькі Граждана і Сабакі. **60.** Полацкі бард, аўтарка «НН». **61.** Газэта беларусаў Польшчы. **62.** Наш кантынэнт. **63.** Беларускі паэт, ляўрэат прэміі Гэрдэра. **65.** Ад яе ў абедзены перапынак не адмовіцца ніводзін нашанівец. **68.** …Маракоў. **71.** Аўтарка «НН», празаік Марыя…. **73.** …Жук-Грышкевіч. **74.** …Жукоўскі. **76.** Падпісчыкі — … газэты. **77.** Літаратурны часопіс 1990-х. **79.** Кніга ў беларускіх мусульманаў. **80.** «Наша Ніва» з гледзішча маркетынгу. **82.** Яе «НН» штовосень жадае добра выкапаць. **83.** Пэрсанажы рубрыкі «Калі б…» часам выклікаюць… **86.** Імя аўтаркі «НН», што ўвесну сядзела ў жодзінскай турме. **89.** Адступ ад галоўнай тэмы, найчасьцей гістарычны. **91.** Філёляг, сябар журы нашаніўскіх літаратурных конкурсаў. **92.** Бібліяфіл, «Чыжык беларускі» першай «НН». **93.** Рэзыдэнцыя беларускага Сакрата. **94.** Беларускі гісторык. **95.** Беларускі музыка, літаратар, мастак, нашанівец. **96.** Смаргонская карэспандэнтка «НН». **97.** Тое, што і выбрык, але па-вучонаму. **98.** Яго робяць з торфу. **99.** Дырэктар беларус-

кай службы папулярнага амэрыканскага радыё. **100.** Увасабленьне цемры ў рэлігіі зараастрыйцаў.

**Па вэртыкалі: 1.** Пра іх пішуць у рубрыцы «Каіса». **2.** Яе ствараюць разам чытачы і аўтары «НН». **3.** Дзейнасьць гэтай установы ў «НН» асьвятляў Якуб Колас (1907). **4.** Грашовы збор на карысьць бедных і чыноўнікаў. **5.** Работы ў рэдакцыі — заўсёды… **6.** Празаік з Горадні, аўтар «НН». **7.** Рэдактар часопісу беларускіх палякаў. **8.** Калярдарны месяц і псэўданім даўняга аўтара «НН». **9.** Папулярызатар беларускай гісторыі зь Менску, якога чытачы «НН» лічаць вартым званьня Народнага пісьменьніка. **10.** …Луцкевіч. **12.** У эпоху першай «НН» — горад Менскай губэрні, цяпер — сталіца Палесься. **13.** Інструмэнт для сьвідраваньня адтулінаў. **14.** …«НН» у 1911 годзе складаў 3000 асобнікаў. **18.** Іншы псэўданім Зьмітрака Бядулі. **20.** Аўтар паэмы «Вялікае Княства». **21.** Ня комік. **23.** Невялікая дзялка. **25.** Тэзаўрус моўных адзінак; у «НН»–2005 ім цешыўся скептык. **26.** У «НН» ён клясычны. **27.** Дзяржаўная беларуская газэта. **28.** «Беларуская…» — дом-музэй М.Багдановіча ў Менску. **30.** Паўднёвы край у Францыі. **33.** Балетная гераіня, на якую, калі верыць «НН» (2005. № 38), упала дэкарацыя. **34.** Імя беластоцкага гісторыка й палітыка, аўтара «НН». **36.** Машэка ў пляне фізычных здольнасьцяў. **39.** Імя вядомага польскага журналіста, аўтара раману «Імпэратар» (ARCHE. 2006. №5). **42.** Імя літоўскага карэспандэнта «НН». **44.** Раньні зборнік Р.Барадуліна. **45.** Паэтка, аматарка «Віна з Каліфорніі». **46.** Імя баранавіцкага настаўніка, які стала піша ў «НН». **49.** Імя героя п.48, а таксама рэдактараў і фатографа «НН». **50.** Райцэнтар на Гомельшчыне, адкуль ідуць лісты ў газэту. **51.** Супрацоўнік «НН», аўтар «Кароткай гісторыі Беларусі» (1910). **53.** Від узнагароды. **54.** Пісьменьнік, сябра беларускага ПЭН-Цэнтру. **56.** Брытанскі драматург, летась наладзіў у Менску майстар-клясу (НН. 2005. №33). **58.** Пад Воршай — агмень паэтычных і мастацкіх фэстаў. **59.** Амэрыканскі дасьледчык, выдаў кнігу пра Беларусь для ангельскамоўнай аўдыторыі (1956). **64.** Трапічная кветка. **66.** Гісторык культуры, у 2005 г. — аўтар рубрыкі «Муштарда» ў «НН». **67.** Прафэсія, што амаль выйшла з моды, але ў Вільні напачатку XX ст. была актуальная. **68.** Фотарэдактар «НН». **69.** Горад, дзе ў 2003 г. В.Гавал уручыў прэмію рэдактару «НН». **70.** Адрэдагаваны й выдрукаваны Л.Сапегам. **72.** Беларускі драматург і кінасцэнарыст 1920—1930-х г., ідэйна блізкі да Л.Ушкіна. **73.** Мэнтар у беларускіх юдэяў. **75.** Вядомы менскі скульптар. **77.** У «НН» ягоныя функцыі выконвалі Г.Рабянкова і С.Петрыкевіч. **78.** «НН» далучылася да яго ў 1997 г. **81.** Беларуска-амэрыканскі сьпявак, аўтар «НН». **84.** Янка Купала — … беларускай літаратуры. **85.** Апостальскі візытатар беларусаў замежжа, сталы аўтар «НН». **87.** Ім пакрываюць стол. **88.** Алей для аўто. **90.** Моладзевы актывіст з Барысава. **91.** Вялікая луста хлеба. **96.** Польскі фантаст, друкаваўся ў «НН».

Літары з клетак, пазначаных сэрцайкам, складаюцца ў галоўную фразу — прагноз на наступнае стагодзьдзе.

**Склаў Вольф**

**Адказы**

**Па гарызанталі: 1.** Шпараг. **4.** Познань. **6.** Анапэст. **9.** Чавусаў. **11.** Дуброва. **12.** Пінтэр. **13.** Кантора. **15.** Лесаруб. **16.** Тэндэр. **17.** Палуян. **19.** Алаіза. **22.** Стыль. **24.** Кася. **29.** Кроква. **30.** Пацюпа. **31.** «Свабода». **32.** Граждан. **35.** Тэатар. **37.** Камоцкі. **38.** Кразье. **40.** Ананім. **41.** Гаспадарства. **43.** Танака. **47.** Ануча. **48.** Расінскі. **52.** Сноў. **55.** Лібава. **56.** Скрыпка. **57.** Дуліна. **59.** Віктар. **60.** Сом. **61.** Ніва. **62.** Эўропа. **63.** Разанаў. **65.** Кілбаса. **68.** Леанід. **71.** Роўда. **73.** Раіса. **74.** Даніла. **76.** Апора. **77.** Крыніца. **79.** Кітаб. **80.** Брэнд. **82.** Бульба. **83.** Рогат. **86.** Тацяна. **89.** Экскурс. **91.** Скобла. **92.** Леўчык. **93.** Крынкі. **94.** Туронак. **95.** Вольскі. **96.** Ліс. **97.** Эскапада. **98.** Брыкет. **99.** Лукашук. **100.** Арыман.

**Па вэртыкалі: 1.** Шахматы. **2.** Гісторыя. **3.** Дума. **4.** Падатак. **5.** Навала. **6.** Астравец. **7.** Пачобут. **8.** Травень. **9.** Чаропка. **10.** Антон. **12.** Пінск. **13.** Калаўрот. **14.** Наклад. **18.** Ясакар. **20.** Зянон. **21.** Трагік. **23.** Лапік. **25.** Слоўнік. **26.** Правапіс. **27.** Звязда. **28.** Хатка. **30.** Правансc. **33.** Жызэль. **34.** Алег. **36.** Асілак. **39.** Рышард. **42.** Андранік. **44.** Нагбом. **45.** Аксак. **46.** Руслан. **49.** Андрэй. **50.** Карма. **51.** Власт. **53.** Ордэн. **54.** Някляеў. **56.** Стопард. **58.** Ляўкі. **59.** Вакар. **64.** Архідэя. **66.** Белы. **67.** Камінар. **68.** Лява. **69.** Прага. **70.** Статут. **72.** Кобец. **73.** Рабін. **75.** Іранкоў. **77.** Карэктар. **78.** Інтэрнэт. **81.** Данчык. **84.** Клясык. **85.** Надсан. **87.** Абрус. **88.** Аліва. **90.** Салаш. **91.** Скіба. **96.** Лем.

**Ключавая фраза:** «Закрасуе ніва наша».



# Шалкевіч прызямліўся

**15 кастрычніка ў канцэртнай залі «Менск» (Малая заля) — вялікі сольны канцэрт Віктара Шалкевіча і прэзэнтацыя яго новага альбому «Гарадзенец прызямліўся ў Менску». Пачатак а 19-й. Кошт квіткоў 8 000—14 000. Даведкі: 649-08-88, 766-24-25**

## НАШЫ ШАШКІ

# Чаму кантора піша

У наш век гульня ў шашкі-64 праз перапіску шмат каму здаецца анахранізмам. Нават «невычарпальныя» шахматы паддаюцца кампутарнаму аналізу, а што казаць пра шашкі, дзе на парадак менш варыянтаў… І ўсё ж менскія энтузіясты штогод арганізуюць некалькі завочных спаборніцтваў па рускіх шашках: вышэйшую і першую лігі паводле клясычнай і сучаснай вэрсіяў, турнір кандыдатаў у майстры і г.зв. турнір разраднікаў, адкрыты для ўсіх ахвотных. Агулам далучаюцца 60—70 шашыстаў з усіх куткоў краіны.

У чым прыцягальнасьць завочных шашак? Ліставаньне дазваляе гульцам праверыць інтэлектуальныя здольнасьці: тэхніка тэхнікай, але канчатковае рашэньне, які ход выбраць, усё адно прымае чалавек. Міжасабовыя зносіны, хай сабе праз карэспандэнцыю, — таксама безумоўны плюс гульні. Нарэшце, сяго-таго яна дысцыплінуе, адцягваючы ад гарэлкі й праступаў…

Чарговы, 41-шы чэмпіянат Беларусі пачнецца 1 лістапада. Заяўкі на ўдзел да 10 кастрычніка прымае сакратар камісіі па завочных спаборніцтвах Міхаіл Гельман. Т.: (017)2578792.

**ВР**

### Ваш ход

М. Лосеў (г. Ворша) — В. Талкачоў (в. Узьдзевічы Магілёўскай вобл.). Першая ліга, 2005—2006. Ход чорных.



**Адказ:** 1…de3! Белыя здаліся: на 2. fd4 было б 2…hf2, а на 2. df4 – fg5X.

# Дзякуй

Зямля пухам эканамісту, старшыню назіральнай рады Белгазпрамбанку **Валер'ю Дашкевічу**, які адышоў ад нас. Апошняе ахвяраваньне на выданьне «НН» ад яго датуецца 15 верасьня і прыйшло пасьля ягонага адыходу.

**Т.А., Н.Ж., Галіне В., А.Т., Аляўціне В., К.К., Юр'ю Б., Руслану П., Клаўдзіі П., Віталю Ф., Пятру Р., Сьвятлане Б., В.К., Сяргею Т., Віктару Б., У.Л., Т.Б., В.К., М.П., Аляксандру П., Ігару С., Марату К., Сяргею Г., Аляксандру К., Г.Я., Уладзімеру С., Уладзімеру М., А.А., Міколу П., Канстанціну Ш., Віктару Д., Уладзімеру Г., Сьвятлане К., В.М., Насьці Т., Уладзімеру К., Алегу Т., Т.Т., Уладзімеру Р., Сьвятлане Р., Ю.В., С.К., Тацяне В., Усеваладу С., Уладзімеру Л., Ніне Ш., Але Р., В.Н., Дар'і С., А.Б., П.Д., Т.П., Васілю Б., С.У., Анатолю С., Р.А., Людміле І., Ірыне Ц., Аляксандру С., Мікалаю К., Юр'ю М., Марыне З., Міхаілу Ж., Т.Л., Андрэю Л., Ігару Я., Алене М., У.К., Веры С., Т.М., Ільясу Х., Уладзімеру Д., Людміле Л., Аляксандру Л., Галіне П., В.П., Аляксандру К., М.Г., С.П., Аляксандру Ш., Анатолю З., Уладзімеру М.** зь Менску.

**А.Р., Сьцяпану Г., Дзьмітрыю П., Г., Зоі Д.** зь Менскага раёну.

**Тамары К.** з Жодзіна.

**Валер'ю Ц.** з Круглянскага раёну.

**Алене Дз., Валянціне М., Юліі Е.** з Навагрудзкага раёну.

**Міхаілу Т., Віталю А.** са Слуцку.

**Вользе Ш.** з Ваўкавыскага раёну.

**Віталю Г.** з Чачэрскага раёну.

**Л.В., Івану Р., Уладзімеру В., С.К.** з Горадні.

**Вользе Б., Сяргею Х.** з Столінскага раёну.

**Георгію С.** зь Бешанковіцкага раёну.

**Андрэю Ч.** з Рагачоўскага раёну.

**Леаніду М., Уладзімеру Л.** зь Берасьця.

**Мікалаю Т.** з Дараганава.

**Яну Г.** з Гарадзенскага раёну.

**Сяргею Г., Вячаславу С., Руслану Р.** з Баранавічаў.

**Антону З.** з Валожынскага раёну.

**Марыі Б., Генадзю Л., Алене Б.** з Гомелю.

**Алегу Р.** з Наваполацку.

**Л.Ш.** з Воршы.

**Валянціне М.** зь Лепелю.

**Аляксандру К.**, Анатолю Б. з Маладэчна.

**Міхаілу К.** з Жыткавіцкага раёну.

**А.І.** з Чэрвеньскага раёну.

**Ніне А., В.П.** зь Бераставіцкага раёну.

**Анатолю А., Васілю К., Валеру С., Ганьне К., А.Ш., Карыне Ш., Ірыне Б.** зь Віцебску.

**Георгію Л.** з Карэліцкага раёну.

**Уладзімеру Л.** з Смургонскага раёну.

**Аркадзю К.** з Івацэвіцкага раёну.

**Юрасю Ч.** з Мазыра.

**Аляксандру П.** з Глыбоцкага раёну.

**Дзьмітрыю К.** з Мастоўскага раёну.

**Я.С., Надзеі Л.** зь Пінску.

**Мікалаю В., Руслану П.** з Пружанскага раёну.

**Сямёну Г.** з Магілёва.

**В.Д., Багуславу Я., Алегу М.** з Барысава.

**Міхаілу К.** з Рэчыцы.

**Уладзімеру А.** з Вушацкага раёну.

**Вользе Р.** з Бабруйску.

**Д.Ц.** з Слонімскага раёну.

Дыяна Леанідаўна зь Менску, паведаміце, калі ласка, нумар сваёй кватэры.

М.В.Е. з вуліцы 17 верасьня, удакладніце адрас.

С.В.А. з Радашкавічаў, дашліце дакладны адрас.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 36000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.



**...Лукашэнка і Чавэс дасягнулі адзінства.**

...Што ты тут накрэмзаў? «Вялікія духі, прыміце ад нашага вэнэсуэльскага плямені ў ахвяру 100 баранаў, 100 леапардаў, 100 рабоў...» Слухай, адкуль у цябе такая любоў да прыпісак?

**...Камітэт быў узмоцнены ў два разы.**






**...Цана «Белтрансгазу», роўная 5 млрд у.а., згодна з АГЛ, не адпавядала рэальнасьці.**

...Саша, а калі яшчэ раз падумаць?..

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЕПІКА УШКІНА

## У НУМАРЫ

### Сымон-музыка выйдзе ў джынсах



«Госьціца» і *Grig Percussion* ставяць на вялікай сцэне Філярмоніі спэктакль-экспэрымэнт. **Старонка 21.**

### Наш мядзьведзік у Бэрліне



На нямецкім вакзале атайбаваўся плястмасавы драпежнік-піянэр зь Беларусі. **Старонка 26.**

### Бульбе далі 10 сутак



**Старонка 13.**

### Як нараджаецца газэта?



Плястыляндыя. **Старонка 24.**

### Мэгакрыжаванка



Да стагодзьдзя «Нашай Нівы». **Старонка 28.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Нашы перасяленцы ў Сібіры**

...за апошнія 15 гадоў выехала з усяе эўрапейскай Расеі ў Сібір бязмала 4 мільёны душ перасяленцаў. Між імі першае месца займаюць украінцы — іх выехала ў Сібір 1 мільён 800 тысяч душ; пасьля ідуць вялікарусы — каля 1 млн 400 тыс., далей беларусы — 600 тысяч душ зь лішкам і ў канцы ўсе іншыя нацыі — каля 200 тыс. душ.

Калі прыраўнуем лік перасяліўшыхся ўкраінцаў, вялікарусоў і беларусоў да ліку астаўшыхся ў сваім краю, дык выходзіць, што прычына, якая гоніць людзей за хлебам у чужыну, — бяда — найболей пануе між украінцамі і беларусамі; з сотні вялікарусоў у Сібір перабралася 2—3 душы, з сотні ўкраінцаў — ня больш 6, а з сотні жыцялёў Беларускай зямлі — ажно 7 душ.

**«Наша Ніва». 1911. №36**

# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 30.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### САЛІДАРНАСЬЦЬ

**Беларусы!** Выявім салідарнасьць з маладафронтаўцамі — прыйдзем на суд па справе «МФ» у якасьці сьведкаў абароны!

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем Ірыну Лаўроўскую** з абаронай доктарскай дысэртацыі ў Варшаве. Сябры зь Менску

**Паважаную Лаўроўскую Ірыну** віншую з абаронай доктарскай дысэртацыі. Вы вельмі патрэбная Беларусі! Мы абавязкова пераможам разам. Жыве Беларусь! Сяржук Бахун

**Алесю зь Ліды** шчыра віншуем з Днём нараджэньня... 

**Віншуем Ігната Крышчанка** з 16-годзьдзем. Зычым шчасьця, здароўя. Жадаем адзначыць 18 у Вольнай Беларусі.

### КНІГІ

**Тэрмінова** набуду факсымільнае выданьне «Нашай Нівы», т.1, 1906–1908 г. Т.: 280-37-81 (Аляксандра), 631-66-19

**«Наша Ніва»**, «ARCHE», кнігі, навучальныя дапаможнікі, слоўнікі, музыка ды фільмы на CD на Румянцава 13 (ТБМ). Асартымэнт штотыдзень мяняецца! Ад панядзелка па пятніцу (15.00 — 19.30). Т.: 707-40-01

**Прадам кнігу** «Ксты» Рыгора Барадуліна, 7 тысяч рублёў. Т.: 204-58-00

**Беларускія кнігі** вазьму на рэалізацыю ад выдаўцоў і аўтараў. Т. 771-49-39. E-mail: kniganosha@tut.by

### ПРАЦА

Якасны набор тэкстаў на беларускай мове, карэктура, рэдагаваньне, запіс на электронныя носьбіты інфармацыі. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00 па тэлефоне: (017) 235-18-72, Юры Сяргеевіч

### ПАДАРОЖЖА

**Запрашаем** у падарожжа 6—9 кастрычніка: Львоў—Жоўква—Падгорны—Олеск. 14—15 кастрычніка: Вільня—Трокі—Меднікі. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 509-12-16, 110-19-28

## ЖАРТ

— Як, дзядзька, думаеш, а ці можа пачацца вайна Расеі з Грузіяй?

— Хіба не. А ну ж грузіны Маскву возьмуць? Як жа тады Пуціну будзе «Газпром» ачоліць?


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2771. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 04.10.2006.

Замова № 5555.

Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.